

ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ — У ПОЛІ ЗРОКУ ДЭПУТАТА 3

СВАЯ НОША НЯЦЯЖКАЯ, КАЛІ ЯНА ПАСІЛЬНАЯ 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

10 САКАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 46 (29926)

## КОРАТКА

- **Усебеларуская акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!» стартуе 13 сакавіка.**
- Дзінара Алімбекава-Смольская заняла 4-е месца ў спрынце на фінальным этапе Кубка Садружнасці па біятлоне.
- **Мінпрацы: на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена больш за 68 тыс. заяў.**
- З наступнага навучальнага года ў Беларусі ўвядуць другі элемент школьнай формы.
- **БелАЗ укарэніць 45 адзінак найноўшага абсталявання ў 2023 годзе.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ЕМЯЛЬЯНЕНКА, намеснік начальніка ўпраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі:**

*«У 2022/2023 навучальным годзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі будзе праведзены адзіны ўрок «Аб чым звоняць званы Хатыні» да 80-годдзя трагічных падзей. Акрамя таго, пройдзе ўрок памяці «Нам гэты мір завешчана берагчы», прысвечаны 78-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Пры распрацоўцы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння адзіных урокаў памяці Нацыянальны інстытут адукацыі выкарыстоўвае інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прадастаўленыя Генеральнай пракуратурай Беларусі».*

З першых вуснаў

# «МЫ ПАСТАВІЛІ ПЕРАД САБОЙ АМБІЦЫЙНУЮ МЭТУ»

### Беларусь плануе выканаць усе працэдуры для ўступлення ў ШАС да чэрвеня бягучага года

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Мінску правёў рабочую сустрэчу з генеральным сакратаром Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Чжан Мінам. Гэта ўжо іх другая сустрэча. Беларускі лідар і генеральны сакратар ШАС сустракаліся ў верасні 2022 года напярэдадні саміту арганізацыі ў Самаркандзе.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт падзякаваў генеральнаму сакратару і сакратарыяту ШАС за работу, што праводзіцца ў адносінах да Беларусі, якую на мінулым саміце фактычна прынялі ў сям'ю Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Вы ведаеце нашу мэту. Для таго каб юрыдычна стаць паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, у Беларусі павінны быць праведзены пэўныя юрыдычныя працэдуры. Мы павінны далучыцца да тых рашэнняў, якія былі прыняты раней Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Мы паставілі перад сабой амбіцыйную мэту — прайсці гэты шлях на працягу бягучага года да саміту ў Дэлі. Гэта хуткі тэмп, сур'ёзны тэмп, але калі вы нас падтрымаеце, гэта будзе добры досвед для іншых», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што будучы назіральнікам у ШАС, Беларусь сур'ёзна рыхтавалася да ўступлення ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. «Таму мы адназначна зможам па тэрмінах уклasціся да чэрвеня, да таго моманту, як у Дэлі мы зноў сустрэнемся, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Нашы мэты вы ведаеце, нашы магчымасці таксама вядомыя ўсім членам ШАС. Я, адзінае, хацеў бы спытаць, ці ёсць у вас якія-небудзь насцярожанасці або пытанні да Беларусі ў працэсе нашага юрыдычнага ўступлення ў арганізацыю», — пацікавіўся Прэзідэнт.

Чжан Мін падкрэсліў, што гэта яго першы візіт у Беларусь. Ён падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за гасціннасць і цеплыню, аказаную дэлегацыі ШАС. Ён прызнаўся, што ў яго засталіся добрыя ўражанні ад папярэдняй сустрэчы з беларускім лідарам, на якой яны абмяркоўвалі пытанні далучэння Рэспублікі Беларусь у ШАС.

СТАР. 2

Перспектыва

# АПК ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

### Як навука змяняе традыцыйны погляд на сельскую гаспадарку

**Лічбавізацыя, бія- і нанатэхналогіі змяняюць сельскую гаспадарку, якая яшчэ нядаўна лічылася адной з найбольш кансерватыўных і традыцыйных сфер дзейнасці чалавека. Цяпер, на думку навукоўцаў, менавіта аграпрамысловы комплекс становіцца свайго роду «дэманстрацыйнай пляцоўкай» апошніх дасягненняў навукі.**



Па ўсім свеце будуюцца рабатызаваныя фермы, складаныя камп'ютары і інавацыйныя тэхніка выкарыстоўваюцца для ўвасаблення ідэй «разумнага» земляробства, лічбавыя тэхналогіі аб'ядноўваюць у адзіную сістэму ўсе этапы вытворчасці сельгаспрадукцыі: ад стварэння новых угнаенняў, кармоў, парод жывёл, сартоў і гібрыдаў раслін да перапрацоўкі малака і мяса, збожжа і круп, агародніны і садавіны ў канчатковы прадукт для спажыўца.

І наколькі развіццё АПК, яго эканамічная эфектыўнасць цесна звязаны з навуковымі даследаваннямі, навукоўцы пачынаюць адыгрываць у працэсе вытворчасці сельгаспрадукцыі адну з вядучых роляў. Што можа прапанаваць беларуская навука сельскай гаспадарцы?

СТАР. 4

Прыёмная кампанія — 2023

# Патрэбы эканомікі, мэтавая падрыхтоўка і прагнозы па конкурсе

**Лічбы прыёму ў ВНУ і ССНУ будуць агучаны да 1 красавіка. Пра гэта паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі ў БелТА першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ.**

«Складанне плана прыёму — вельмі тонкая і карпатлівая работа, бо неабходна ўвязаць патрэбы ўсіх галін эканомікі і ўсе ўзроўні адукацыі», — патлумачыў ён.



СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпісвайся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на ІІ квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «МЫ ПАСТАВІЛІ ПЕРАД САБОЙ АМБІЦЫЙНУЮ МЭТУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*Наша краіна ўдзельнічае ў ШАС з 2010 года ў статусе партнёра па дыялогу і з 2015 года — у статусе назіральніка. 16 верасня 2022 года на палях пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС у Самаркандзе было падпісана рашэнне аб пачатку працэдуры ўступлення Рэспублікі Беларусь у члены Арганізацыі. У лістападзе 2022 года беларускім бокам распрацаваны алгарытм па ўступленні ў ШАС у паскораным фармаце. 17 студзеня 2023 года на пасяджэнні Савета нацыянальных каардынатараў арганізацыі падпісаны Пратакол па выніках кансультацый упаўнаважаных прадстаўнікоў дзяржаў — членаў ШАС з упаўнаважаным прадстаўніком Беларусі. Гэтым дакументам афіцыйна запушчана працэдура далучэння нашай краіны. 9 лютага 2023 года падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 31, якім адобраны праект Мемарандума аб абавязацельствах Беларусі ў мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена ШАС. Беларусь актыўна выступае за ўмацаванне эканамічнага вымярэння ШАС у якасці найважнейшага фактару стабільнасці ў Еўразійскім рэгіёне.*

**У тэму**

## Па хуткасці прыняцця рашэння — беспрэцэдэнтна

У размове з журналістамі генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва падкрэсліў: пасля дзвюх сустрэч з Прэзідэнтам у яго склалася ўражанне, што беларускі бок аддае вялікую ўвагу далучэнню да ШАС і завяршэнню дадзенай працэдуры. «Беларуския намаганні ў гэтым кірунку заслужылі вялікую ўвагу з боку дзяржаў — членаў ШАС. Усе дзяржавы — члены арганізацыі пры каардынацыйнай ролі сакратарыята пачалі працаваць над пытаннем далучэння Беларусі. І за два месяцы было прынята рашэнне аб старце працэдуры далучэння. Па хуткасці прыняцця рашэння — беспрэцэдэнтна. Гэта сведчыць аб тым, што ўсе дзяржавы-члены вельмі цэняць, што беларускі бок падзяляе каштоўнасці і прынцыпы ШАС і на працягу многіх гадоў у якасці назіральніка адыгрываў важную ролю ў супрацоўніцтве ў рамках ШАС», — сказаў Чжан Мін. Па яго словах, за мінулыя некалькі месяцаў беларускі бок сумесна з усімі дзяржавамі — членамі ШАС і сакратарыятам правёў вялікую работу і зрабіў вялікія намаганні па каардынацыі і прасоўванні працэдуры далучэння. Пад старшынствам Індыі ўсе дзяржавы — члены ШАС разгледзелі і абмеркавалі згаданую тэму. На цяперашні момант разгляд і абмеркаванне яшчэ вядзецца.

«Хачу адзначыць, што ўклад, які Беларусь на працягу многіх гадоў уносіла ў арганізацыю, прызнаны ўсімі дзяржавамі-членамі, і яны вельмі тое цэняць», — заявіў генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

## ШАС з'яўляецца адной з апор шматпалярнага свету

Міністр замежных спраў Сяргей Алейнік у размове з журналістамі заўважыў, што Беларусь на ўсіх этапах актыўна ўдзельнічала ў рабоце ШАС: і ў якасці партнёра для дыялогу, і ў якасці назіральніка. Наша краіна актыўна ўдзельнічае ва ўсіх асноўных вымярэннях дзейнасці арганізацыі: палітыка-дыпламатычным, гандлёва-эканамічным і культурна-гуманітарным, а таксама ў ваенным супрацоўніцтве. У 2022 годзе на долю дзяржаў ШАС прыпадала амаль 70 працэнтаў усяго тавараабароту Рэспублікі Беларусь. Па словах міністра, такая лічба пацвярджае важнасць развіцця эканамічнага вымярэння ўзаемадзеяння нашай краіны з ШАС. «Мы бачым вялікія перспектывы, вялікі патэнцыял гэтага супрацоўніцтва і разлічваем актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх вымярэннях не толькі ў гандлі, але і ў прамысловай кааперацыі. Сёння на парадак дня арганізацыі выходзяць пытанні прамысловасці, энергетыкі, ёсць міжбанкаўскае ўзаемадзеянне. Фарміруюцца альтэрнатыўныя варыянты разлікаў, якія вельмі важныя для пераадолення незаконных абмежавальных мер, што прымяняюцца краінамі Захаду. Праводзіцца вялікая работа ў сферы транспарту і выбудоўвання транзітна-лагістычных ланцужкоў, неабходных для падтрымання неабходнага ўзроўню гандлю і эканамічнага ўзаемадзеяння паміж краінамі», — расказаў Сяргей Алейнік.

Міністр замежных спраў падкрэсліў, што сённяшні статус Беларусі ў якасці назіральніка не дае магчымасці паўнацэнна ўдзельнічаць ва ўсіх фарматах арганізацыі. Напрыклад, Савет міністраў замежных спраў уключае толькі прадстаўнікоў дзяржаў-членаў. Гэта датычыцца і іншых фарматаў у іншых галінах. «Таму паўнапраўнае членства шырэй адчыніць для нас дзверы і дазволіць больш эфектыўна ўдзельнічаць ва ўсіх фарматах работы. І мы бачым у тым сур'ёзныя перспектывы не толькі для эканамічнага супрацоўніцтва, але і для палітыка-эканамічнага ўзаемадзеяння. Гэта важна, таму што ШАС з'яўляецца адной з апор шматпалярнага свету. І вельмі важна быць уцягнутымі ў працэсы ўмацавання шматпалярнасці з пазіцыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва», — растлумачыў ён.

Як заўважыў Сяргей Алейнік, многія ініцыятывы, якія вылучаліся Прэзідэнтам Беларусі, былі падтрыманы. У прыватнасці, правядзенне сумеснага саміту АДКБ і ШАС па сітуацыі ў Афганістане ў 2021 годзе. «Гэта добры прыклад таго, як беларускія ініцыятывы знаходзяць сваё адлюстраванне ў дзейнасці арганізацыі. Таму наша паўнапраўнае членства ў ШАС надасць імпульс не толькі нашаму ўзаемадзеянню ў цэлым, але і з дзяржавамі — членамі арганізацыі. З усімі мы падтрымліваем добрыя дружалюбныя адносіны, якія носяць партнёрскі і ў некаторых выпадках стратэгічны характар», — канстатаваў міністр.

**Падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пасяджэнні парламента Грузіі адмянілі з-за пашкоджання будынка пратэстоўцамі




Пленарныя пасяджэнні ў парламенце Грузіі, запланаваныя на бягучым тыдні, адмяняюцца з-за ўрону, які быў нанесены падчас беспарадкаў на мітынгах 7 і 8 сакавіка. Пра гэта гаворыцца ў заяве апарату заканадаўчага органа, паведаміла ТАСС. У парламенце дзейнічае рэжым абмежаванага допуску людзей. У будынак заканадаўчага органа будуць упускаць толькі тых людзей, якія будуць займацца ацэнкай урону, растлумачылі ў апараце. Як вядома, у Тбілісі 7 і 8 сакавіка прайшлі шматтысячныя акцыі пратэсту пасля таго, як парламент у першым чытанні прыняў грузінскую версію законапраекта аб агентах замежнага ўплыву. Удзельнікі абодвух мітынгаў былі жорстка разагнаны глыбокай ноччу сілавікамі, якія прымянілі вадамёты і слёзатачывы газ. За два дні пратэстаў затрымана звыш 130 чалавек. Пасля хваляванняў у сталіцы раніцай 9 сакавіка кіруючая партыя «Грузінская мара» выразіла адмовіцца ад разгляду амерыканскай версіі праекта. У лютым у парламенце краіны зарэгістравалі дзве версіі законапраекта аб іншаагентах — грузінскую і амерыканскую, якая з'яўляецца перакладам Закона ЗША аб рэгістрацыі замежных агентаў. Паводле грузінскай версіі, замежным агентам можа быць прызнаны і СМІ, пры гэтым ініцыятыва не датычыцца фізічных асоб. Амерыканская версія адносіцца не толькі да юрыдычных, але і да фізічных асоб і таксама прадугледжвае крымінальную адказнасць.

### У Стамбуле за пяць гадоў расселяць 1,5 мільёна дамоў з-за магчымага землетрасення

Улады плануюць рассяліць каля 1,5 млн. жылых дамоў у 17-мільённым Стамбуле на працягу пяці гадоў з-за рызыкі іх абвальвання ў выніку магчымага землетрасення. Пра гэта расказаў міністр экалогіі і горадабудаўніцтва Турцыі Мурат Курум, паведаміла ТАСС. «Звыш 70 % тэрыторыі Турцыі размешчана ў сейсмічна небяспечных зонах. Адным з такіх раёнаў з'яўляецца Стамбул. Па 500 тысяч новых дамоў будзе ўзведзена ў еўрапейскай і азіяцкай частках горада, столькі ж пабудуюць на месцы ранейшых будынкаў», — прыводзіць словы міністра тэлеканал CNN Turk. Турэцкія сейсмолагі прагназуюць магчымае землетрасенне магнітудай 7-7,5 у раёне Стамбула, які знаходзіцца на стыку Анаталійскай і Еўразійскай тэктанічных пліт. Пры такіх штуршках, як адзначаецца, каля 90 тысяч будынкаў можа абваліцца адразу, 260 тыс. будуць пашкоджаны і стануць непрыдатнымі для пражывання, часовае жыллё спатрэбіцца 4,5 мільёна жыхароў мегаполіса.



### У Даніі знайшлі найстарэйшую згадку бога Одзіна



Дацкія эксперты паведамілі аб выяўленні самай ранняй згадкі скандынаўскага бога Одзіна на залатым брактэаце — дыску з чаканкай, які быў знойдзены ў 2020 годзе. Як паведамляецца на сайце Нацыянальнага музея Даніі, ранней самым старажытным артэфактам, які адсылае да бажаства, была брошка другой паловы VI стагоддзя. Выяўлены брактэат на 150 гадоў старэйшы. На дыску з партрэтам мужчыны — меркавана, караля або шанаванага чалавека, — быў расшыфраваны рунічны надпіс «Гэта чалавек Одзіна». Эксперты адзначаюць складанасць праведзенай работы, бо некаторыя руны сцерліся, а тэкст у цэлым быў адчаканены без прабелаў паміж словамі.

# «Цягнік Памяці» будзе праводзіцца кожны год

### У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні падрыхтоўкі і правядзення беларуска-расійскага патрыятычнага, культурна-адукацыйнага праекта

**Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ключавое пытанне, на якім была сканцэнтравана ўвага ўдзельнікаў пасяджэння, датычылася падрыхтоўкі і правядзення беларуска-расійскага патрыятычнага, культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці».**

У пасяджэнні арганізацыйнага камітэта ўзялі ўдзел кіраўнікі некаторых міністэрстваў і арганізацый, у фармаце відэа-канферэнц-сувязі — прадстаўнікі Мінгарвыканкама і аблвыканкамаў.

Спікер верхняй палаты парламента нагадала, што праект «Цягнік Памяці» ўпершыню быў праведзены ў 2022 годзе Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Саветам Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі. Яго ўдзельнікамі былі дзесяцікласнікі — па 100 чалавек ад Беларусі і Расіі, якія праехалі па 15 гарадах, памятных мясцінах дзвюх краін, дзе праходзілі баі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што гэтае мерапрыемства прайшло на даволі высокім арганізацыйным узроўні. «Хлопцы і дзяўчаты пасябравалі, яны трымаюць зносіны да гэтага часу, — паведаміла Старшыня Савета Рэспублікі. — Яны былі захоплены нашай краінай, наведваючы беларускія гарады. Мы арганізоўвалі не толькі мерапрыемствы, прысвечаныя памятным падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Былі прадугледжаны культурная праграма, азнаямленне з тымі рэгіёнамі, раёнамі, гарадамі, дзе хлопцы і дзяўчаты спыняліся. У мінулым годзе мы спрацавалі вельмі цудоўна. Неабходна правесці гэта важнае мерапрыемства сёлета».

Як адзначыла Наталля Качанава, склад удзельнікаў праекта «Цягнік Памяці» будзе пашыраны. Мяркуецца, што да дзяцей з Беларусі і Расіі далучацца школьнікі з некаторых былых краін Савецкага Саюза. Дакладна вызначана, што маршрут цягніка, на якім паедуць удзельнікі праекта, праляжа па тэрыторыі Беларусі і Расіі. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што мерапрыемства стане традыцыйным і будзе праводзіцца штогод. Старт гэтай патрыятычнай акцыі заўсёды будзе дадзены ў Брэсце 22 чэрвеня, а 3 ліпеня, як і ў мінулым годзе, праект фінішуе ў Мінску.

Наталля Качанава нагадала, што летась удзельнікі праекта сустракаліся з кіраўніком нашай краіны. Па яе словах, гэта была асаблівая падзея ў жыцці кожнага маладога чалавека. «Моладзь дзвюх краін вельмі чакае гэты праект, — заўважыла спікер верхняй палаты парламента. — Хлопцы і дзяўчаты высока яго ацанілі. Яны настолькі паглынуты гэтым. Вельмі многія пытаюцца, як сёлета стаць удзельнікамі гэтага важнага праекта».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, сёння такія праекты, як «Цягнік Памяці», вельмі важныя. «Цяпер, калі фашызм, нацызм падымаюць галаву, мы не павінны гэтага дапусціць, — адзначыла яна. — Мы з вамі выдатна разумеем: калі будзем памятаць, будзем захоўваць памяць аб той страшнай трагічнай гісторыі, якая была ў жыцці нашага народа, — гэта ў большай ступені будзе гарантыяй таго, што ні фашызму, ні нацызму ніколі не перамагчы на нашай зямлі».

**Вераніка КАНЮТА.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 11 сакавіка, з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 226 99 26;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Юрый Уладзіміравіч ПЯРНАЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дмітрый Вадзімавіч АЛЕЙНІКАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл.8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

У сваёй акрузе

# Дашкаляты ў прадчуванні наваселля

**На Гомельшчыне працягваецца практыка рэканструкцыі карпусоў былых аздараўленчых лагераў пад неабходныя для густанаселенай сельскай мясцовасці аб'екты дашкольнай адукацыі. Падчас работы ў выбарчай акрузе на тэрыторыі Гомельскага раёна дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар ЗАВАЛЕЙ азнаёміўся з тым, як вырашаецца пытанне забеспячэння насельніцтва дашкольнай адукацыяй на тэрыторыі Чонкаўскага сельскага Савета.**



У зоне адказнасці парламентарыя — населеныя пункты Добрушскага раёна і 15-і сельскіх Саветаў Гомельскага. Штомесяц падчас работы ў выбарчай акрузе дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сустракаецца з жыхарамі аграгарадкоў і вёсак, працоўнымі калектывамі, наведвае сацыяльна значныя аб'екты вясковай інфраструктуры.

Чонкі — спадарожнік Гомеля. Пасёлак актыўна развіваецца ў плане жыллёвай забудовы. Таму на асаблівым кантролі мясцовых уладаў — інфраструктура аб'ектаў адукацыі. Тры гады таму на тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета ўпершыню ў рэгіёне быў адкрыты новы дзіцячы сад на 65 месцаў «Вясёлка-град». Ён узнік на месцы рэканструяванага корпуса былога дзіцячага аздараўленчага лагера «Чонкаўскі бор». Тады за дзевяць месяцаў абнавілі і цалкам перапланавалі пакоі для груп, асобныя спальныя пакоі, спартыўна-музычную залу, невялікую колькасць службовых памяшканняў. На будаўніцтва «Вясёлка-града» выдаткавалі 1,5 мільёна рублёў. Актыўна ў падрыхтоўку да адкрыцця новай дашкольнай установы ўключыліся прадпрыемствы раёна: набылі спартыўнае абсталяванне, горкі, сенсорныя дарожкі, сухі басейн, дывановыя пакрыцці.

Між тым ужо на момант адкрыцця новага дзіцячага садка было вядома: новы аб'ект вырашае праблему недахопу месцаў часткова. Для развіцця дашкольнай адукацыі ў Чонках кіраўніцтвам рэгіёна перад будаўнікамі была акрэслена новая задача — рыхтавацца ў далейшым да рэканструкцыі яшчэ двух санаторных карпусоў пад дашкольную ўстанову.

Цяпер атрыманы вопыт будзе прыменены зноў. У рамках новай інвестыцыйнай праграмы рэгіёна выдаткаваны сродкі на адкрыццё другога корпуса дзіцячага садка «Вясёлка-град». Такім чынам праблема недахопу месцаў для дашкалят у Чонках будзе поўнасцю вырашана.

— Па меры пашырэння новага мікрараёна жылой забудовы і росту колькасці жыхароў сельсавета зноў паўстала праблема недастатковай колькасці месцаў у дашкольных установах. Звярталіся з ёй выбаршчыкі і падчас маіх асабістых прыёмаў, — распавёў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар Завалей. — Цяпер мы можам казаць аб тым, што пытанне блізкае да вырашэння. Пачынаецца рэканструкцыя яшчэ аднаго корпуса аздараўленчага лагера. Пасля яе завяршэння дзіцячы садок атрымае яшчэ 60 месцаў для дашкольнікаў.

Ігар Завалей разам з загадчыкам дзіцячага садка «Вясёлка-град» Аленай Драбянковай і старшынёй Чонкаўскага сельвыканкама Аляксеем Кобзаравым наведаў памяшканне, дзе ўжо пачаліся падрыхтоўчыя работы перад рэканструкцыяй будынка.

Праект новага корпуса аналагічны дзеючай дашкольнай установе з некаторымі дапаўненнямі. Як цяпер арганізавана работа «Вясёлка-града», ацаніла Алена Драбянкова.

— Створаныя ўмовы не толькі дазваляюць дзецям усебакова развівацца, але і дапамагаюць умацоўваць здароўе. Бо мы знаходзімся ва ўнікальным курортным месцы, — звярнула ўвагу кіраўнік дзіцячага садка. Яна адзначыла, што пытанняў з падвозам дзяцей не ўзнікае.

Новы корпус дашкольнай установы плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ўжо першага верасня бягучага года.

Як адзначыла начальнік аддзела адукацыі Гомельскага райвыканкама Алена Кавалёва, працягваецца работа па стварэнні дадатковых месцаў ва ўстановах адукацыі ў населеных пунктах, якія актыўна развіваюцца і забудоўваюцца. Так, сёння распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя на капітальны рамонт будынка Раманавіцкай сярэдняй школы, выконваюцца работы па ўстаноўцы сістэмы кантролю і кіравання доступам у 13 установах адукацыі для бяспечнага знаходжання навучэнцаў. Наогул за апошнія тры гады на тэрыторыі Гомельскага раёна былі капітальна адрамантаваны 10 устаноў адукацыі. Для бяспекі дзяцей у 40 установах адукацыі раёна ўстанавілі ручныя сістэмы трывожнай сігналізацыі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Патрэбы эканомікі, мэтавая падрыхтоўка і прагнозы па конкурсе

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Плануецца, што кантрольная лічбы прыёму на бюджэт захаваюцца прыкладна на ўзроўні мінулага года з невялікім ухілам у бок тых спецыяльнасцяў, па якіх ёсць дэфіцыт кадраў, і з ухілам у рэгіёны. «Ёсць даручэнне: мінус два працэнты па Мінску і плюс два працэнты па рэгіёнах, дзе ёсць дэфіцыт па медыцынскіх кадрах, па настаўніках і ў іншых сферах. Гэта ўсё будзе ўлічана. Што да лічбаў прыёму на платную форму навучання, набор застанецца прыкладна на ўзроўні мінулага года. Калі суміраваць бюджэт і платную форму, то плануецца набраць на першы курс 47-48 тысяч чалавек. Каля 27 тысяч першакурснікаў будуць навучацца на бюджэце і 21-22 тысячы — за ўласныя сродкі. Але гэта папярэдняя інфармацыя», — удакладніў першы намеснік міністра.

Што тычыцца мэтавай формы падрыхтоўкі, то, як адзначыў Аляксандр Бахановіч, яна будзе планамерна развівацца і папулярызавацца ў грамадстве: «Школьнікі вельмі зацікаўлены пайсці на мэтавую падрыхтоўку, асабліва гэта датычыцца медыцынскіх і педагагічных спецыяльнасцяў. Існуе памылковае меркаванне, што на мэтавую падрыхтоўку ідуць самыя непадрыхтаваныя. Гэта абсалютна не так. Я думаю, тыя іспыты, якія чакаюць сёлета будучых мэтавікоў, будуць прынцыповыя».

Для тых, хто паступае на мэтавыя месцы, створана асаблівая траекторыя паступлення. Сёлета яны будуць здаваць адзін вусны ўнутраны іспыт па першым профільным прадмеце, а тэрміны прыёмнай кампаніі для іх выдзелены ў асобны этап. Падаць дакументы і прайсці сумоўе абітурыенты-мэтавікі павінны з 1 да 5 чэрвеня. Уступны іспыт для іх адбудзецца з 6 да 13 чэрвеня. Залічваць гэту катэгорыю абітурыентаў будуць да 16 чэрвеня.

Першы намеснік міністра адзначыў, што цяпер зняты ўсе абмежаванні па мэтавай падрыхтоўцы: скарыстацца гэтай формай падрыхтоўкі кадраў пад свае патрэбы можа любое прадпрыемства і любая арганізацыя, размешчаныя ў любым населеным пункце, у тым ліку і ў сталіцы.

«Па медыцынскіх спецыяльнасцях мы дазваляем набіраць на мэтавую падрыхтоўку да 80 працэнтаў ад агульнай колькасці бюджэтных месцаў, у аграпрамысловым комплексе — да 70 працэнтаў, па шэрагу іншых спецыяльнасцяў — да 60 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму. Але гэта не значыць, што мы павінна набраць менавіта 80 працэнтаў мэтавікоў. Колькі іх будзе — столькі будзе. Усе астатнія месцы, якія былі запланаваны пад мэтавую падрыхтоўку, пяройдуць на агульны конкурс», — растлумачыў ён.

Першы намеснік міністра заўважыў, што варыянтаў знайсці сабе месца для будучага працаўладкавання яшчэ на этапе паступлення ў ВНУ дастаткова. Напрыклад, школьнік можа наведаць кірмашы мэтавай падрыхтоўкі. Яны праводзяцца на базе ўніверсітэтаў, куды запрашаюцца прадстаўнікі прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі.

Найбольш высокія конкурсы ў ВНУ Міністэрства адукацыі прагназуе сёлета на спецыяльнасцях IT-сферы і медыцынскіх. Разам з тым у міністэрстве разлічваюць, што складзецца высокі конкурс і на педагагічных спецыяльнасцях. «Для гэтага ёсць усе перадумовы: ва ўсіх рэгіёнах дзейнічаюць профільныя педагагічныя класы, прадугледжана магчымасць паступлення пасля педагагічнага каледжа на завочную форму навучання на педагагічныя спецыяльнасці без уступных іспытаў, — растлумачыў свае прагнозы Аляксандр Бахановіч. — Увогуле, вопыт паказвае, што незапатрабаваных спецыяльнасцяў практычна няма. За гэтым стаіць каласальная работа па аналізе сусветных тэндэнцый і развіцці галін».

На сёння ў Беларусі функцыянуе 42 дзяржаўныя ўстановы вышэйшай адукацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні 12 міністэрстваў і ведамстваў, а таксама 8 устаноў вышэйшай адукацыі прыватнай формы ўласнасці. Падрыхтоўка кадраў ажыццяўляецца па 387 спецыяльнасцях I ступені і па 159 спецыяльнасцях II ступені адукацыі. Як падкрэсліве першы намеснік міністра, вядзецца пастаянная работа па ўзмацненні практыка-арыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. «ВНУ ўзгадняюць навучальныя праграмы з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў. Усяго на сёння ўзгоднена больш як 24 тысячы вучэбных праграм і дысцыплін. Гэта сведчыць аб тым, што наш навучальны працэс абапіраецца на патрэбы прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі і мы ўлічваем тэндэнцыі развіцця ўсіх галін нашай эканомікі», — дадаў Аляксандр Бахановіч.

Ён паведаміў, што на працягу 2022 года ўніверсітэты заключылі больш як 550 дагавораў з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў аб узаемадзеянні. Усяго іх на сёння — больш за 2,7 тысячы. Таксама ўстановы вышэйшай адукацыі заключылі летась больш як 2,8 тысячы мэтавых дагавораў. Цяпер такіх дагавораў дзейнічае каля 10 тысяч. Гэта значыць, што каля 10 тысяч нашых студэнтаў ад агульнай колькасці навучаюцца па мэтавай падрыхтоўцы адпаведна з мэтавымі дагаворамі», — адзначыў Аляксандр Бахановіч.

На высокатэхналагічных прадпрыемствах краіны, у арганізацыях і інстытутах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на працягу 2022 года было створана 80 новых філіялаў кафедраў устаноў вышэйшай адукацыі. А ўсяго ў арганізацыях эканомікі і сацыяльнай сферы функцыянуе 1069 філіялаў кафедр.

У ВНУ дзейнічаюць больш як 70 сумесных з вядучымі сусветнымі кампаніямі лабараторый і 10 адукацыйных цэнтраў вядучых сусветных кампаній. Студэнты медыцынскіх устаноў вышэйшай адукацыі праходзяць навучанне на 126 клінічных кафедрах ва ўстановах аховы здароўя. Практыку ў арганізацыях — заказчыках кадраў у мінулым навучальным годзе прайшлі больш як 64 тысячы студэнтаў.

Закрануў першы намеснік міністра і пытанне з адтэрміноўкай ад службы ў арміі студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю за межамі Беларусі. Аляксандр Бахановіч падкрэсліў, што для тых студэнтаў, якія працягваюць вучыцца за мяжой, адтэрміноўкі ад службы ў войску застануцца. Аднак ён праінфармаваў, што цяпер на разглядзе ў парламенце знаходзяцца папраўкі, якія датычацца падстаў для атрымання права на адтэрміноўку ад прызыву на воінскую службу. У тым выпадку, калі змены будуць прыняты, адтэрміноўку ад службы ў арміі для студэнтаў з Беларусі, якія вучацца за мяжой, адменяць.

«У нашых суседзяў, калі студэнты едуць вучыцца за мяжу, таксама няма адтэрміновак, — звярнуў увагу першы намеснік міністра. — Мы прыводзім заканадаўства ў адпаведнасць з тым, што ёсць у нашых суседзяў. У нас павінны быць роўныя правы і магчымасці». Акрамя таго, як адзначыў Аляксандр Бахановіч, у заканадаўстве застанецца норма аб адтэрміноўцы для беларускіх абітурыентаў, якія па заказе органа дзяржкіравання або прадпрыемства былі накіраваны на вучобу за мяжу. Гэта датычыцца тых выпадкаў, калі па пэўных спецыяльнасцях падрыхтоўка ў Беларусі не вядзецца, аднак дзяржава мае вострую патрэбу ў такім спецыялісце. «Для іх гэтыя адтэрміноўкі застануцца», — дадаў першы намеснік міністра адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

У тэму

## Унікальныя кадры для аўдыту

Новая спецыяльнасць «Дзяржаўны аўдыт» адкрыецца на эканамічным факультэце БДУ. Падрыхтоўка па гэтым напрамку ў Беларусі будзе весціся ўпершыню. Выпускнікам прысвояць кваліфікацыю «Эканаміст. Спецыяліст па аўдыце».

Як адзначыла дэкан эканамічнага факультэта Ганна Каралёва, падрыхтоўка такіх спецыялістаў арыентавана, у першую чаргу, на фінансава-эканамічную дзейнасць дзяржаўных устаноў і органаў дзяржаўнай улады. «Да гэтага часу навучанне кадраў па аўдыце было сфакусіравана на бухгалтарскім уліку ў арганізацыі і асаблівасцях яго прымянення ў розных сферах дзейнасці. Мы ж зробім акцэнт на падрыхтоўку ўнікальных кадраў, прафесійныя навыкі якіх будуць запатрабаваны ў сферы экспертна-аналітычнай, кантрольнай і аўдытарскай дзейнасці. Атрыманая адукацыя дазволіць выпускнікам эфектыўна працаваць у дзяржаўным сектары: кантрольных, праваахоўных, фінансавых органах, а таксама ў сферы бізнес-аўдыту і кансалтынгу, рэалізавацца па іншых кірунках эканамічнай спецыяльнасці».

Дарэчы, рыхтаваць спецыялістаў будуць на стыку эканамічных, прававых і інфармацыйных дысцыплін. Адукацыйная праграма ўключае навучальныя прадметы «Фінансы», «Дзяржаўны бюджэт», «Падаткі і падаткаабкладанне», «Міжнародныя стандарты фінансавай справаздачнасці», «Бухгалтарскі ўлік і аўдыт», «Кіраўніцкі ўлік», «Процідзеянне карупцыі» і іншыя.

Адкрыццю спецыяльнасці садзейнічала цеснае супрацоўніцтва эканамічнага факультэта з заказчыкамі кадраў. Плануецца, што да 60 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму будзе аддадзена пад мэтавы набор.

# АПК ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

## «ДЗІЦЯЧАЕ ХАРЧАВАННЕ» ДЛЯ ЦЯЛЯТ

Прадукцыйнасць кожнай каровы ў малочнай жывёлагадоўлі, акрамя генетычных фактараў, залежыць ад нюансаў яе вырошчвання і закладваецца з першых дзён жыцця цяляці. І гэты паказчык можна палепшыць з дапамогай правільнага «дзіцячага харчавання», адзначаюць навукоўцы. Як падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі» Мікалай БАКАЧ,** ад умоў утрымання і кармлення цяляці залежыць больш за 60 % далейшай прадукцыйнасці жывёлы.

— З другога тыдня жыцця цяляці для фарміравання ў яго стрававальнай сістэмы неабходна ў дадатак да малака ўводзіць у рацыён спецыяльныя камбікармы і дабаўкі, — распавёў навуковец. — Намі былі распрацаваны тэхналогіі і комплект абсталявання для вытворчасці лёгка засваяльных канцэнтратаў на аснове мясцовай збожжавай сыравіны.

У аснову «дзіцячага харчавання» для цялят пакладзена ідэя апрацоўкі сумесі збожжавых кампанентаў шляхам экструдзіравання і змешвання з сухімі мінеральнымі дадаткамі. Але працэс экструдзіравання корму энергаёмісты. Каб знізіць выдаткі, распрацавана тэхналогія такой апрацоўкі папярэдне нагрэтага да 80 градусаў збожжа: выкарыстоўваецца сістэма індукцыйнага нагрэву з дапамогай магнітнага поля. Гэта дазваляе скараціць выдаткі на вытворчасць «дзіцячага харчавання» для цялят на 20 %, а яго выкарыстанне ў далейшым павышае прадукцыйнасць жывёлы на 6,5 %, адзначыў Мікалай Бакач.

## ДНК-ТЭХНАЛОГІІ Ў СЕЛЕКЦЫІ

І ўсё ж ролю генетыкі — выведзення новых парод сельскагаспадарчых жывёл і ўдасканалення існуючых — у прадукцыйнасці малочнай і мясной вытворчасці цяжка пераацаніць. У нашы часы адным з паказчыкаў якаснай работы селекцынераў з'яўляецца ў тым ліку хуткасць атрымання выніку. Беларускія навукоўцы выкарыстоўваюць сучасныя метады селекцыі і ў прыватнасці індэксную ацэнку жывёл, распавёў **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па жывёлагадоўлі» Уладзімір ЦІМАШЭНКА.**

— Індэксная ацэнка дазваляе вызначыць патэнцыял прадукцыйнасці, здольнасць перадаваць па спадчыне прадукцыйную якасць, характарыстыкі жывёл і эканамічную значнасць гэтых прыкмет, — растлумачыў навуковец. — Актыўна ўкараняюцца ў вытворчасць метады ДНК-тэхналогій, якія прайшлі навуковую апрабацыю, — дадаў ён.

ДНК-тэхналогіі мяркуюць вызначэнне генных маркераў, звязаных з тымі ці іншымі патрэбнымі селекцыянеру паказчыкамі, і назапашванне гэтых прыкмет у шэрагу пакаленняў, сказаў спецыяліст. Гэтыя тэхналогіі дазваляюць выключыць з узнаўлення непажаданых «удзельнікаў» — напрыклад, жывёл, якія маюць маркеры схаваных генетычных хвароб. Такім чынам, эфектыўнасць і хуткасць селекцыі ўзрастае ў два-два з паловай раза.

— Апрацоўка даных ажыццяўляецца з дапамогай аўтаматызаваных сістэм, інтэграваных у агульную сістэму племянной справы Беларусі, — падкрэсліў вучоны.

У сферы навуковых інтарэсаў НПЦ па жывёлагадоўлі таксама — прадухіленне шкоднага ўздзеяння мікратаксінаў на арганізм жывёл і распрацоўка рэцэптур сарбентаў, якія звязваюць і выводзяць розныя шкодныя рэчывы, а таксама даследаванні па ўкараненні ў кармленне мікраэлементаў у форме нана-часціц.

Як распавёў Уладзімір Цімашэнка, беларускія навукоўцы распрацавалі тэхналагічныя прыёмы і рашэнні, якія дазваляюць праектаваць фермы, што не саступаюць найлепшым комплексам краін з традыцыйна высокаразвітой малочнай жывёлагадоўляй. Але яшчэ адзін кірунак — распрацоўка тэхналогій, якія дазваляюць забяспечыць сучасную вытворчасць на свінакомплексах, пабудаваных 30 і больш гадоў таму.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## БЕЛАРУСКІЯ ПЕРСІКІ І ЧАРЭШНЯ

Праца айчынных селекцыянераў у раслінаводстве атрымала прызнанне практыкаў: так, у пасадцы бульбы сарты айчыннай селекцыі займаюць па Беларусі кожны год 60—65 %. Беларускія сарты ў пасадцы яблыні і грушы складаюць каля 80 %, а калі казаць пра агародніннія культуры — больш за 20 %. Такія лічбы агучыў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве» Андрэй ЧАЙКОЎСКІ.**

— Паводле звестак на 2023 год, для арсенальнага агароднiцтва ўключаны 102 сарты і 34 гібрыды па 34 культурах, — распавёў навуковец.

Ён адзначыў, у прыватнасці, што ў апошнія гады створана 25 сартоў і гібрыдаў таматаў — ад дробнаплодных да буйнаплодных, рознай афарбоўкі і на любы густ. Яны прызначаны для вырошчвання ў адкрытым грунце і цяпліцах.

— Акрамя таго, створаны 15 сартоў і гібрыдаў агуркоў. Асноўная стаўка робіцца на грунтавыя, пчолаапыляльныя, чарнашыпыя, універсальнага прызначэння. Маюцца і сарты для вытворчасці карнішонаў, — сказаў Андрэй Чайкоўскі. — Па белакачаннай капусце створана лінейка з 18 сартоў і гібрыдаў: ад ранніх да позніх, што дазваляе рэалізаваць канвеернае спажыванне.

Таксама з'явілася восем сартоў айчыннай цыбулі, шэсць — буракоў і морквы з высокімі смакавымі якасцямі і добрай захавальнасцю.

— Створаны сарты беларускай селекцыі і па іншых агародніннных культурах, у тым ліку малараспаўсюджаных, — адзначыў ён.

Вучоны анансаваў некалькі найбольш цікавых, на яго думку, новых сартоў і гібрыдаў сельгаскультур — для сельгасарганізацый, фермераў і дачнікаў. Напрыклад, сярэднепозні гібрыд капусты белакачаннай «Марана» мае патэнцыяльную ўраджайнасць 110 тон з га, устойлівы да хвароб і захоўваецца да сакавіка. А сярэднясьпелы гібрыд «Варта» ідэальны для квашання, яго ўраджайнасць — 120 ц/га.

— Хачу прадставіць таксама апошнія навінкі па агурку — партэнакарпічны гібрыд «Духмяны» для адкрытага грунту з ураджайнасцю 50—60 тон з га і «Пачастунак» для цяпліц — 15 кг з квадратнага метра.

Першы айчынны гібрыд скарасспелай цыбулі «Тутэйшы» паказаў ураджайнасць у аднагадовай культуры да 77 тон з гектара. А новы сорт кабачка «Бонус» характарызуецца вельмі нізкім утрыманнем нітратаў і падыходзіць для выкарыстання ў дзіцячым харчаванні.

Цікавымі навінкамі для дачнікаў і фермераў напярэдадні новага садова-агароднага сезона могуць стаць беларускі ранні сорт чарэшні «Беліца», а таксама сарты абрыкоса «Камея» і «Лявон», персіка — «Лойка», фундука — «Лал» і «Яшма».

— Па выніках выпрабаванняў да сельгасвытворчасці дапушчаны дзевяць новых сартоў бульбы, — паведаміў Андрэй Чайкоўскі. — Сярод іх, у прыватнасці, сярэднясьпелыя «Гарантыя» і «Водар», што пераўзыходзяць па ўраджайнасці знакаміты «Скарб», кантрольны ў сваёй групе спеласці.

## «РАЗУМНЫЯ» ЎГНАЕННІ

А ў Інстытуце глебазнаўства і аграхіміі сёння працуюць над стварэннем новага пакалення «разумных» угнаенняў. Пра гэта распавёў **дырэктар РУП «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі» Юрый ШАШКО.** Такія ўгнаенні адрозніваюцца ад звыклых тым, што маюць пралангіраваны або кантрольны тэрмін дзеяння. «Разумныя» ўгнаенні могуць быць як без дабавак, так і з дадаткамі мікраэлементаў, рэгулятараў росту і біяраскладальных палімераў.

Вучоны адзначыў, што сёння ў Інстытуце глебазнаўства і аграхіміі распрацаваны ўвесь неабходны асартымент угнаенняў — парадку 84 марак комплексных, цвёрдых і вадкіх — для асноўных сельскагаспадарчых культур, якія вырошчваюцца ў нашай краіне.

— Гэта 76 марак грануляваных комплексных угнаенняў са збалансаванымі суадносінамі элементаў харчавання для асноўнага ўнясення ў глебу, а таксама восем марак вадкіх комплексных угнаенняў, у тым ліку бясхлорных, з хелатнай формай мікраэлементаў для некаранявых падкормак, — растлумачыў ён.

Яшчэ адзін найважнейшы кірунак работы інстытута — даследаванні глебы. Створаны банк, дзе прадстаўлена больш за 23 тысячы глебавых разрэзаў, адзначыў вучоны. Распрацаваны нарматывы супрацьэразійнай устойлівасці глеб, сістэма проціэразійных севазваротаў, глебава-эразійная карта Беларусі. Вядзецца работа па распрацоўцы мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне ўрадлівасці глеб і абарону іх ад дэградацый.

## КАНТРОЛЬ І БЯСПЕКА

Фінальнае звяно ланцужка «вытворца — спажывец» — эфектыўная перапрацоўка сельгаспрадукцыі. І адна з найважнейшых сусветных тэндэнцый тут — мінімізацыя адходаў харчовай вытворчасці. Напрыклад, такая каштоўная сыравіна, як малочная сыроватка, да нядаўняга часу лічылася адыходам вытворчасці сыроў і тварагу, нават існавалі праблемы з яе утылізацыяй. Сёння ў Беларусі перапрацоўваецца каля 99 % малочнай сыроваткі — найкаштоўнейшага прадукту, багатага пратэінамі, вітамінамі і мікраэлементамі. Сучасная дыеталогія сцвярджае, што бялкі, якія змяшчаюцца ў сыроватцы, багацейшыя біялагічна актыўнымі рэчывамі за любы іншы бялок. Цеснае супрацоўніцтва на працягу 15 гадоў вучоных РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па харчаванні» з Мінсельгасхарчам і прадпрыемствамі малочнай прамысловасці дала магчымасць выйсці на лідарскія пазіцыі па перапрацоўцы малочнай сыроваткі, расказаў **генеральны дырэктар РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па харчаванні» Аляксей МЕЛЯШЧЭНЯ.** Завяршаецца будаўніцтва новага цэха на базе аднаго з вядучых малочных прадпрыемстваў, што дазволіць перапрацоўваць усе 100 % малочнай сыроваткі і нават адчуваць некаторы яе дэфіцыт, адзначыў навуковец.

А ў цэлым, штогод у НПЦ па харчаванні распрацоўваецца больш за 200 рэцэптур для розных узроставых груп.

— Традыцыйна асаблівую ўвагу ўдзяляем пытанням імпартазамяшчэння, і сумесна з беларускімі прадпрыемствамі нам удаецца з году ў год іх вырашаць, — падкрэсліў Аляксей Меляшчэня.

Адным з найважнейшых кірункаў работы НПЦ па харчаванні з'яўляецца распрацоўка нацыянальных і міждзяржаўных стандартаў. Яны задаюць тон і патрабаванні да прамысловасці па якасных характарыстыках, біялагічнай каштоўнасці прадуктаў харчавання і іх бяспецы. Дзякуючы ім практычна ўсе галіны харчовай прамысловасці сёння сталі, без перабольшання, візіткай Беларусі, сказаў вучоны.

— Нашы патрабаванні часта нават больш жорсткія, чым патрабаванні тэхнічных рэгламентаў мытнага саюза. Гэта дазваляе забяспечваць узровень карыснага і смачнага харчавання на ўнутраным рынку, а таксама пастаўляць нашу прадукцыю на экспарт, — пераканаы генеральны дырэктар НПЦ па харчаванні.

Бяспека прадуктаў харчавання заслугоўвае самай пільнай увагі навукоўцаў, таму работа вядзецца ў сферы распрацоўкі сучасных метадаў яе кантролю, адзначыў навуковец.

— Адна з апошніх нашых распрацовак, якая сёння ўкараняецца ў Беларусі, — вызначэнне патэнцыяльна небяспечных эфіраў у алейна-тлушчавай прадукцыі і прадуктах харчавання з яе выкарыстаннем. Гэтыя эфіры ўтвараюцца ў працэсе паглыбленай перапрацоўкі, — распавёў Аляксей Меляшчэня. — Адпрацоўка тэхнічных прыёмаў па іх змяншэнні дазволіла дасягнуць паказчыкаў, якія адпавядаюць найвышэйшым сусветным патрабаванням.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

Нябесная канцылярыя

# Сакавіцкія «арэлі»

### Гэта калі ў нядзелю будзе ісці снег, а ўжо ў аўторак прыгрэе да плюс 12

У першы месяц вясны ў нашай краіне амаль заўсёды «гуляе» вельмі няўстойлівае надвор'е. У гэты час серыя атмасферных франтоў, чаргуючыся, працягне аказваць свой уплыў на кліматычныя ўмовы. Вось і ў найбліжэйшыя 5 дзён будзе то холадна, то амаль горача, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу ўплыў франтальнага раздзела распаўсюдзіцца на большую частку тэрыторыі краіны. Таму ў гэты дзень снег, мокры снег, па паўднёвай частцы — з дажджом, будуць адзначацца ў большасці раёнаў. Па паўднёва-заходняй частцы краіны чакаюцца моцныя ападкі, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Месцамі туман, іней. У асобных раёнах мяцеліца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, а ў паўднёвых раёнах — да плюс 8 градусаў.

У суботу надвор'е пачнуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, які ссоўваецца з Польшчы на Латвію. Яны абумовяць на большай частцы тэрыторыі краіны ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай месцамі слабы галалёд, на паўночным усходзе слабая мяцеліца, налiпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 7 градусаў па паўночным усходзе, у сярэдзіне дня слупкі тэрмометраў пакажуць плюс 1—7 градусаў, па поўдні — да 10 градусаў цяпла.

А вось 12 сакавіка цыклон перамесціцца на паўночна-заходнія раёны еўрапейскай часткі Расіі, а тэрыторыя Беларусі акажацца ў яго тылавой частцы. Адразу пахададае на ўсёй тэрыторыі краіны. У гэты дзень паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя ападкі, у асноўным снег, мокры снег. Месцамі слабая завіруха. На асобных участках дарог галалёдзіца. Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад 0 да мінус 6 градусаў, а днём — ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, няўстойлівае з ападкамі надвор'е захаваецца і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак ноччу ў асноўным па паўднёвым захадзе, удзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаецца снег і мокры снег, днём пераходзячы ў дождж. Месцамі слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да мінус 1—7 градусаў, а па поўначы — да мінус 9 градусаў. Днём будзе мінус 1 — плюс 5 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 8 цяпла.

А ў аўторак ноччу яшчэ будзе водгулле зімы, а днём — амаль сапраўдная вясна. 14 сакавіка часам прагназуюцца ападкі, у асноўным дождж, ноччу па паўночным усходзе снег, мокры снег. Месцамі туман. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 5 градусаў па паўночным усходзе. Днём паветра прагрэецца да плюс 3—10 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне родным і блізкім дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання Злотнікава Андрэя Анатолевіча ў сувязі з яго смерцю.**

Сядзі і глядзі

# На «Беларусь 3» — «Новыя людзі»

**На сацыякультурным тэлеканале працягваецца запуск прэм'ерных праектаў. Цяпер па суботах у эфірным меню ёсць яшчэ і «Новыя людзі». У перадачы у цэнтры ўвагі — маладыя таленты, лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, стыпендыяты спецфонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.**

Праграма раскажа пра новае пакаленне беларусаў. Тэатр, музыка, харэаграфія, жывапіс, літаратура — героі праекта арганічна развіваюцца ў розных кірунках, дабіліся і працягваюць дабівацца значных поспехаў. «Новыя людзі» — гэта галоўным чынам аповед пра тое, што папярэднічае поспеху, пра загартоўванне характару і доўгі шлях пераадолення сябе.

Героі перадачы раскрываюцца з розных бакоў. Здымачная група праводзіць з імі некалькі дзён, каб распавесці не толькі пра творчыя дасягненні, але і пра пошукі, пра тое, у чым маладыя людзі знаходзяць натхненне і супакаенне, з чаго чэрпаюць сілы для новых перамог.

— Галоўная задача праекта — паказаць, як фарміруецца асоба. Узрост герояў нашай праграмы вагаецца ад 15 да 22 гадоў. Яны толькі пачынаюць свой шлях, — кажа **рэжысёр праграмы Надзея ГАБЕЦ**. — Мы раскажам пра іх дасягненні, але акцэнт зробім на працэсе фарміравання поглядаў, маральных якасцяў, разумення паняццяў дабра і зла новым чалавекам.

У прэм'ерным выпуску праекта гледачы пазнаёміліся з Ціханам і Сяргеем Талкачовымі, маладымі скульптарамі, навучэнцамі Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава. А 11 сакавіка гераіняй праграмы стане балерына Ганна Гурыновіч, вучаніца Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа. Ёй усяго толькі 16 гадоў, але яна ўжо лаўрэатка многіх конкурсаў. На яе ўскладаюць надзеі і яе настаўнікі. У кампаніі гераіні гледачы наведаюць тэатр, пабываюць у галерэі Міхаіла Савіцкага і ў іншых месцах, дзе зможам паназіраць за тым, як з падлетка фарміруецца балерына.

— Кожны раз, рыхтуючы праграму, мы бачым працаздольнасць і талент нашых герояў. І гэта захапляе, але разам з тым і суперажываеш ім, шчыра жадаеш, каб кожнаму хапіла сіл не страціць сябе і працягваць сваім талентам служыць дабру, — кажа Надзея Габец.

Глядзіце і адкрывайце для сябе «Новых людзей» на тэлеканале «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 167

**Сваю задачу даслаў нам Міхаіл Мароз з Барысава (*гл. дыяграму*).**



**Белыя:** Крb3, Лb6, Лf7, Се2, Ch8, Kd2, пd4 (7).

**Чорныя:** Крd5, Ла7, Лh6, Cg3, пп. а3, b5, е4, f4, g6 (9).

Мат за 2 хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013,) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

Фінішаваў зладжаны выданнем па шахматнай кампазіцыі «Альбіна» міжнародны конкурс памяці беларускага складальніка Дзмітрыя Жылко. У раздзеле шматхадовак удзельнічалі 23 задачы 19 аўтараў з 8 краін.

**Прызы:** І — Яўген Фамічоў, Аляксандр Сыгураў (Расія); ІІ — Аляксандр Панкрацьеў, Юрый Гарбаценка (Расія); ІІІ — Віктар Волчак (Беларусь), Леанід Макаронец (Ізраіль); IV — Леанід Любашэўскі, Л. Макаронец (Ізраіль).

Наступная задача атрымала першы прыз.

**Белыя:** Крс7, Фh1, Лb5, Лf3, Са7, Cg2, Kf1, Kg8, пп. d5, е7, f5, g4 (12).

**Чорныя:** Кре5, Фh6, Ch8, пп. а6, b7, с3, d3, е3, е6, f4, h2 (11).

Мат за 4 хады.

1...Фh~ 2. Cd4+! Кре4 3. Л:е3+ Kpd4 4. Ле4х, 2...Кр:d4 3. Л:f4+ Кре5 4. Ле4х; 1...Фg5 2. Л:е3+! fe 3. Ф:h2+ Фf4 4. Ф:h8х Рашае 1. Лb6! ~ 2. Л:е6+! Ф:е6 3. Л:е3+! fe 4. Ф:h2х; 1...ef 2. е8Ф+! Kpd5 3. Л:f4+! Kpc5 4. Лb5х, 2...Kpd4 3. Лb4+! Кр:d5 4. Л:f4х; 1...Кр:d5 2. Л:f4+! Кре5 3. Ле4+ Kpd5 4. Лd6х; 1...Kpd4 2. Лb4+! Kpd5 3. Л:е3+! f3 4. С:f3х, 2...Кре5 3. Cd4+! Кр:d5, Кре4 4. Л:f4, Л:е3х

Пачэсныя водгукі: І — Відадзі Заманаў (Азербайджан), В. Волчак (Беларусь); ІІ — В. Волчак, Л. Макаронец; ІІІ — Сцівен Доўд (ЗША), Мірка Дэгенколбэ (Германія); IV — Эльмар Абдулаеў (Азербайджан); V — Міраслаў Світэк (Чэхія).

**Пахвальныя водгукі:** І — В. Заманаў, В. Волчак; ІІ — М. Світэк; ІІІ — А. Панкрацьеў; IV — Генадзь Мацюшын; V — Іван Анціпін (Расія); VI — Аляксандр Варыцкі (Беларусь).

**Падраздзел мініяцюр**

**Прызы:** І — Э. Абдулаеў; ІІ — В. Волчак; спецыяльны — Віктар Жук (Беларусь).

**Пачэсныя водгукі:** І — Юрый Аляксееў (Расія); ІІ — В. Волчак.

**Пахвальны водгук** — Мікалай Бельчыкаў, Васіль Жуковіч (Беларусь).

* * *

У Мінску прайшоў Мемарыял славутага гросмайстра Давіда Бранштэйна па хуткіх шахматах. Сярод 199 удзельнікаў было 8 гросмайстраў, тры міжнародныя майстры і 11 майстроў FIDE. 1-2 месцы падзялілі гросмайстар Сяргей Жыгалка і майстар FIDE Максім Царук — па 8,5 бала з 10 магчымых. 3—5 месцы (па 8 балаў) занялі гросмайстры Андрэй Гаравец і Андрэй Кавалёў, а таксама Аляксей Краміч, 6—12 месцы (па 7,5 бала) — гросмайстры Дзяніс Лазавік, Віталь Цецераў, Ігар Люцко, майстры FIDE Арцём Стрыбук і Міхей Навуменка, а таксама Сяргей Вашчылаў і Арцём Бяляўскі.

У бліцтурнірах на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 7-е месца з 515, а Сяргей Жыгалка — 18-е з 391.

* * *

Задача М. Кошаля з мінулага выпуску рашаецца: 1. Лb8! Задачы В. Жука:

№ 1. 1. Сс5 (2. Фf5х) Kpf4 2. Фg4+, 1...Kpd3 2. Фg2; блізня: 1. Сс5 Kpf4 2. Фf5+. М.Кошаль прапануе наступную рэдакцыю: белыя Крb4, Фf2, Cd6, Kg4 — чорны Кре4. Не вядзе да мэты 1.Cf4? Kpd3! або 1.Сс5? Kpd5! Рашае 1.Ке3! (2.Сс5) Kpd4 2.Сс5+, 1...Kpd3 2.Сс5.

№ 2. 1. Cd3 Kpf3 2. Ке3; блізня: 1. Кре1 Kpf3 2. Ке3. М. Кошаль прапануе не задачу-блізня, а зноў рашаць пазіцыю пасля першага ходу белых 1.Cd3 (тады да мэты вядзе 1.Се2). Гэта так званая форма падоўжанай задачы.

Правільна адказалі Ігар Ананіч, Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Час кіно

# Авантура з непрадказальным фіналам

**На тэлеканале «Беларусь 3» на выхадных можна паглядзець прыгодніцкі фільм «Зямля Саннікава», створаны рэжысёрамі Альбертам Мкртчанам і Леанідам Паповым у 1973 годзе.**

Хоць кінастужка, знятая па матывах аднайменнага навукова-фантастычнага рамана Уладзіміра Обручава, з'явілася паўстагоддзя таму, але і сёння яна па-ранейшаму цікавая для аўдыторыі. Дарэчы, сам літаратурны твор, што стаў асновай для фільма, быў напісаны ў 1924 годзе, а ўпершыню апублікаваны толькі ў 1926-м. Сцэнарый да будучага фільма пісаў ужо Уладзіслаў Федасееў. Аднак адзін з рэжысёраў Мкртчан прыняў рашэнне перапрацаваць сцэнарый і звярнуўся з тым да Марка Захарава, які ў той час актыўна займаўся публіцыстыкай. І потым рэжысёр згадваў: «Мы напісалі зусім іншую гісторыю, да сюжэта Обручава яна амаль не мае ніякага дачынення. Адзінае, што засталося ад аўтара, — гэта ідэя: невядомая зямля, якую патрэбна адкрыць».

Для натуральных здымак выкарыстоўваліся экзатычныя мясціны: лядовы паход здымалі на Фінскім заліве, а Зямлю Саннікава — у Даліне гейзераў (Краноцкі запаведнік на Камчатцы). Сцэну пад'ёму Крастоўскага на званіцу здымалі ў Выбаргу, на Гадзіннікавай вежы. Дарэчы, у выкананні трука пад'ёму бралі ўдзел ленінградскія альпіністы. Падчас здымак сцэны аператар заўважыў, што ў кадр трапляюць тэлевізійныя антэны на дахах суседніх дамоў. Давялося ўдзельнікам здымачнай групы паднімацца туды і здымаць антэны. З-за гэтага жыхары дамоў не змаглі паглядзець футбольны матч, што выклікала абурэнне ў людзей, і яны выйшлі на вуліцу. Каб згладзіць скандал, мясцовым жыхарам па ўказанні рэжысёра выдалі па 100 рублёў... Што датычыцца акцёрскага складу, то першапачаткова па рэжысёрскай задумцы туды павінны былі ўвайсці Армен Джыгарханян, Ігар Ледагораў, Яўген Міронаў. Але ў выніку героя Ільіна сыграў Уладзіслаў Дваржэцкі, катаржніка Губіна — Юрый Назараў, а роля здрадніка Ігнація дасталася Георгію Віцыну.



Пазнавальны фільм яшчэ і сваёй кампазіцыяй «Есть только миг», версіі якой выконвалі Алег Анофрыеў, Алег Даль, Мікалай Растаргуеў. У самой карціне яе выконвае Анофрыеў (ён выконвае ўсе кампазіцыі ў фільме), аднак на экране гледачы бачаць у гэты момант Алега Даля. Дарэчы, першапачаткова да ўдзелу ў фільме планавалі далучыць Уладзіміра Высоцкага. Ён так натхніўся сюжэтам карціны, што напісаў для яе тры песні. З-за збегу абставін яны так і не трапілі ў «Зямлю Саннікава», як і сам Высоцкі, бо на адведзеную яму ролю (Крастоўскага) запрасілі Алега Даля.

«Больш за сто гадоў таямніца зямлі, згубленай паміж арктычных ільдоў, хвалявала вандроўнікаў, але ніхто не мог дасягнуць яе...» — гаворыцца ў апісанні сюжэта. А самі героі апавядаюць гісторыю сваёй вандроўкі з экрана, нібы нагадваючы, што авантурызм — рыса непераможная, пытанне толькі, чым такія памкненні могуць скончыцца. Не прапусціце сустрэчу з класікай прыгодніцкага кіно 11 і 12 сакавіка днём у эфіры сацыякультурнага тэлеканала.

**Алена ДРАПКО.**


## «Са "Звяздою" — спадручней!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем прасаў Holt HT-IF-010 і суперпрыз — вертыкальны пыласос Deerma DX700S. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 29 красавіка 2023 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2023 года. Пасля 30 чэрвеня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 38 ад 25 лютага 2023 года.



**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4288 ад 15.02.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2023 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________

*(аддзяленне сувязі)*

____ **на ІІ квартал або І паўгоддзе 2023 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [      ] *(індэкс)* ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

### Беларусь 1

**05.25 Драма «Абрыколь» (16+).**
**7.25** Слова Архібіскупа Іосіфа Станеўскага на Дзень святога Юзафа, Заручніка Панны Марыі.
**7.35** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.15** «Арсенал» (12+).
**9.50** Гісторыі выратавання (12+).
**10.20** Таямніцы следства (12+).
**10.50** Маршрут пабудаваны (12+).
**11.20** Пытанне нумар адзін.
**11.50** Беларуская суперажанчына.
**12.15** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.40 Драма «Апошні пялёстак» (16+).**
**13.35** «Я ведаю» (6+).
**15.20** Вакол планеты.
**16.00** Адзін дзень (12+).
**16.30, 19.15 Драма «Без цябе» (12+).**
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.30 Драма «Заўтра будзе новы дзень» (16+).**

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
**9.00** «Зразумець. Прабачыць». Дак. драма (16+).
**10.25, 18.30** Тэлебарометр.
**10.30** М/с «Барбоскіны» (0+).
**10.45** «Я з вёскі» (12+).
**11.20** «Аб здароўі: жартам і сур'ёзна». Відэачасопіс (16+).
**11.50** «Вежа. Маладзёжная будоўля» (12+).
**12.40** Лікбез (12+).
**12.45** «На нажах» (16+).
**14.40** «Бітва за цела» (16+).
**15.50 Меладрама «Баця» (16+).**
**17.10** «Дарагая, я забіў» (16+).
**18.55 Баявік «Людзі Ікс-2» (16+).**
**21.10** Спартлато 5 з 36, КЕНА.
**21.20 Баявік «Час патрыётаў» (16+).**
**23.00** «Новы дзень» (12+).

### Беларусь 3

**7.30** «Святыні Беларусі».
**7.55** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**8.10 «Аляксандр Неўскі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня».
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45** «Веды ў кубе».
**12.25 «Дача». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**13.50** «Жывая спадчына».
**14.20 «Над Цісай». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.45** Харэаграфічны спектакль «Ад смутку да веселля» ў выкананні Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі».
**16.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**17.00** «Акрыляй».
**18.45 «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.00** «Культурны тыдзень».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Крымінальны талент». Маст. фільм (12+).**
**23.45** «Люблю і памятаю».

### Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Нафтан» (Наваполацк).
**8.50** Спартыўныя бальныя танцы. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.
**10.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Урал» (Екацярынбург) — «Дынама» (Масква).
**12.50** Змешаныя адзінаборствы. Л. Эдвардс (Ямайка) — К. Усман (Нігерыя).
**13.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Хімкі» (Маскоўская вобл.) — ФК «Растоў».
**15.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
**18.15** Гульня галавой.
**19.00** Вялікі футбольны вечар.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ЦСКА (Масква) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
**21.45** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Барселона» — «Рэал» (Мадрыд).
**0.55** Вынікі тыдня.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10 Фільм «Трын-трава» (16+).**
**9.10** «Метэагід».
**9.35** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Народны кухар. Новы сезон» (12+).
**11.55** «Народны ДАСТ» (12+).
**12.30** «Бачылі відэа?» (6+)
**14.15, 16.20 Серыял «Крывое люстэрка душы» (16+).**
**18.10** «Тры акорды» (16+).
**20.00** Контуры.
**21.15** «Ядро па імені Сонца» (16+).
**22.25 Фільм «Белы снег» (6+).**
**0.50** «Маё Роднае. Фізкультура» (12+).

### СТБ

**6.20** Дак. праект (16+).
**8.20 «Глухар». Серыял (12+).**
**10.00** «Вялікі горад».
**10.30, 13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.40, 13.45 «Адплата». Серыял (16+).**
**16.45** «Сенат».
**17.00 «Праспект абароны». Серыял (16+).**
**19.30** «Тыдзень».
**21.00** «Спорт-таймер».
**21.15 «Шэф-3. Новае жыццё». Серыял (16+).**
**1.05 «Ганмен» (18+).**

### МІР

**5.00, 4.50** Мультфільмы (6+).
**8.05 Маст. фільм «Казка пра страчаны час» [СЦ] (0+).**
**9.30** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены» [СЦ] (0+).**
**11.30, 16.15 Маст. фільм «Вялікая перамена» [СЦ].**
**16.45, 19.30 Серыял «Забойства на траіх» (12+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**21.40, 1.00 Серыял «Марафон для трох грацый» (12+).**
**1.50 Маст. фільм «Яды, або Сусветная гісторыя атручэнняў» (12+).**
**3.30 Маст. фільм «Першая пальчатка» [СЦ] (0+).**

### РТР—Беларусь

**7.05 Фільм «Не будзь маёй жонкай» (16+).**
**10.25** «Ранішняя пошта з Мікалаем Баскавым».
**11.00, 17.00** Весткі.
**11.30 Фільм «Муж шчаслівай жанчыны» (12+).**
**13.10 Серыял «Наперадзе дзень» (12+).**
**18.00** «Песні ад усёй душы» (12+).
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «САСС упаўнаважаны заявіць».
**21.55** Фільм «Добры дзень» (12+).
**23.30** Масква. Крэмль. Пуцін.
**0.00** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20** Азбука спорту.
**6.30** «Погляд на Беларусь» (12+).
**6.55** Беларусы (6+).
**7.25** «Дача» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.55** Адзін дзень (12+).
**9.30** «Навука побач» (6+).
**10.25** Ежа хоць куды (6+).
**10.55** «Кватэрнае пытанне.by» (12+).
**11.25** «Першая перадача» (16+).
**11.55** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.40** «Дачны адказ» (0+).
**13.35** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.25 Фільм «У барацьбе за Украіну» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.20** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.40 Серыял «Капкан для Папялушкі» (12+).**

### 8 канал

**7.00, 14.15, 19.45, 21.35, 1.55** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад «Зверапой-2».
**9.00** «Гатуй як шэф» (12+).
**9.10 Драма «Барсаліна» (12+).**
**11.15 Драма «Карына» (12+).**
**14.20** Мультпарад (0+).
**16.15 Серыял «Ацаленне» (12+).**
**19.15** «Суперлато».
**19.50** «Любімае кіно».
**21.25** «Вечарніца» (0+).
**21.40 Драма «У палоне ў моды» (16+).**
**0.20 Серыял «Перасякаючы рысу» (18+).**



### ВТБ

**6.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00** «Лаві момант» (16+).
**8.15** «Раніца з гумарам» (16+).
**12.00** Серыял «Уцёкі» (16+).
**13.40** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**15.10** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**15.30** Серыял «Філатаў» (16+).
**16.25** Серыял «Пастукайся ў мае дзверы» (16+).
**17.15** Серыял «Кухня. Вайна за атэль» (16+).
**19.00, 1.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.20** Серыял «Чорнае каханне» (16+).
**22.00** Серыял «Мая мама — шпіён» (16+).
**23.00** Драма «1+1» (12+).
**1.40** Серыял «Беглыя сваякі» (16+).
**3.20** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**4.55** «6 кадраў» (16+).
**5.30** Серыял «Ералаш» (6+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Неўскі каўчэг.
**7.35, 1.15** «Адраджэнне дырыжабля». Дак. фільм.
**8.20** «Жыццё і лёс».
**8.40** «Дні і гады Мікалая Батыгіна». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.15** XX стагоддзе.
**12.15** «Эрнест Бо. Імператар рускай парфумерыі». Дак. фільм [СЦ].
**13.10** Лінія жыцця [СЦ].
**14.05, 16.25** Колер часу.
**14.10** «Першае, другое і кампот». Гісторыі і рэцэпты савецкага грамадскага харчавання». Дак. фільм [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. АРТ.
**15.20** «Агора».
**16.35** «Дні і гады Мікалая Батыгіна». Маст. фільм [СЦ].
**17.55, 1.55** Лаўрэаты.
**19.00** «Маналог вольнага мастака» [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Захавальнікі жыцця. Мечнікаў». Дак. фільм [СЦ].
**21.30** «Саці. Нясумная класіка...»
**22.15** «Узыход Асманскай імперыі». Дак. драма [СЦ].
**23.00** «Маналог у 4 частках. Андрэй Хржаноўскі» [СЦ].
**23.50** «Магістр гульні» [СЦ].

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Вясна» (16+).
**7.50** Маст. фільм «Каханне перад сняданкам» (16+).
**9.00** «Быў час» (16+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**11.35, 13.50, 15.40, 17.35, 20.30, 21.40, 23.35, 1.00, 2.45, 3.40, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**12.00** Маст. фільм «Ніначка» (16+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**18.00** Маст. фільм «Гамлет» (16+).
**0.00** «Да і пасля...» (16+)
**1.20** Маст. фільм «Мы не жанатыя» (16+).

### EuroSport 1

**3.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету, Осла. Жанчыны (6+).
**5.00, 5.30** Лыжнае двабор'ства (6+).
**6.00, 6.45, 15.00, 15.30, 17.00, 17.45** Веласпорт (6+).
**7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 13.30, 14.15** Горныя лыжы (6+).
**9.30, 18.20, 22.25, 23.35, 2.30** Скачкі на лыжах з трампліна (6+).
**10.30** Шорт-трэк (6+).
**11.30, 0.15** Лыжныя гонкі (6+).
**12.30, 13.00, 20.15, 20.45** Біятлон (6+).
**21.25** Дзюдо (6+).
**1.00** Трыятлон (6+).

### Кінакамедыя

**0.50** «Дэкрэтны адрыў» (16+).
**2.40** «Мужчына па выкліку-2» (16+).
**4.10** «Як украсці мільён» (16+).
**6.35** «Superнянь» (16+).
**8.10** «Кепскія дзяўчынкі» (12+).
**10.00** «Куленепрабівальныя» (12+).
**11.50** «Грозны тата» (6+).
**13.40** «Сястрычка, дзейнічай» (12+).
**15.30** «Сястрычка, дзейнічай-2» (12+).
**17.35** «Мільярд» (12+).
**19.30** «Гудзонскі ястраб» (16+).
**21.20** «Нянькі» (16+).
**23.05** «Каўказская палонніца!» (12+)

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.55** «Ведзьмакі свету» (16+).
**10.45** «Доктар I».
**11.15** «Глядзі сам» (16+).
**11.30** «Хопіць чутак» (16+).
**12.00** «Сны» (16+).
**12.55** «Аб здароўі. Жартам і сур'ёзна» (16+).
**13.25, 19.50, 0.30** «Сляпая» (16+).
**14.25, 20.50, 1.20** «Варажбітка» (16+).
**15.25** «Паралельны свет» (16+).
**16.20** «Відавочцы» (16+).
**16.50** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**17.25** «Паглядзім» (12+).
**17.55** «Урачы» (16+).
**18.55** «Гучныя справы» (16+).
**21.50** «Ганна-дэтэктыў» (16+).
**23.35** «Грым» (16+).
**2.10** «Развітанне» (16+).
**2.50** «Фарсаж» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### ТБ1000

**5.30** Буба (6+).
**6.20** Мая Анджэла, якая гаворыць (6+).
**6.40** Дзікія скрычары (6+).
**8.15** Монстры на канікулах (6+).
**9.50** Монстры на канікулах-2 (6+).
**11.20** Варкрафт (16+).
**13.30** Эспен у каралеўстве троляў (6+).
**15.25** Эспен у пошуках Залатога замка (6+).
**17.20, 18.05** Мерлін (12+).
**19.00** Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў (16+).
**21.10** Успаміны аб будучыні (16+).
**23.30** Удалечыні ад звар'яцелага натоўпу (16+).
**1.35** Сківіцы (16+).
**3.35** Сківіцы-2 (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.10** Смяшарыкі (6+).
**7.00** Тры каты (6+).
**7.45** Фіксікі (6+).
**8.40** Сямейны бюджэт (12+).
**10.30** Родныя (12+).
**12.10** Адчайныя дольшчыкі (16+).
**13.55** Вяселле па абмене (16+).
**15.35** З 8 Сакавіка, мужчыны! (12+)
**17.15, 18.05** Доктар Жывага (16+).
**19.00** 14+ (16+).
**20.55** Усё добра (12+).
**22.40** Каралева (12+).
**0.10** Дублёр (16+).
**1.35** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**2.50** Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
**4.15** Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак (16+).

### National Geographic

**6.00, 5.45** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25, 7.10, 0.05, 0.55** Надзвычайны доктар Пол (16+).
**8.00, 8.45, 18.30, 19.20** Аўта-SOS (16+).
**9.35, 10.20, 16.00** Дзікі тунец (16+).
**11.10, 12.00, 16.45, 17.35, 22.30, 23.20, 4.10, 5.00** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**12.45, 1.45** Унутры неверагодных механікі (16+).
**13.35, 2.30** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**14.25** Аляска. Новае пакаленне (16+).
**15.10** Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
**20.10, 21.00, 21.45, 3.25** Кантрабанда з Марыяй ван Зэлер (16+).

### ЯСНАе

**5.05** Серыял «Жукаў» (16+).
**6.55** Маст. фільм «Апошні браняпоезд» (16+).
**9.05** «Ясна аб кіберспорце».
**9.30** Серыял «Смерць шпіёнам. Скрыты вораг» (16+).
**11.20** Серыял «Ваенная разведка: Паўночны фронт» (16+).
**13.00** Серыял «Фронт» (16+).
**14.45** Маст. фільм «Бухта смерці» (16+).
**16.35** Серыял «Знішчальнікі» (12+).
**18.05** Серыял «Без права на памылку» (16+).
**19.55** Серыял «Другія» (12+).
**21.30** «Ясна аб футболе».
**22.00** «Ясна аб хакеі».
**22.35** Дак. фільм «90-я. Выпуск 1. Бандыцкае кіно» (16+).
**23.20** Маст. фільм «Багі Егіпта» (12+).
**1.25** Футбол. Расійская Прэм'ер-ліга. «Спартак» — «Паходня».
**3.05** Дак. серыял «Спадчына» (6+).
**3.35** Серыял «Сын бацькі народаў» (16+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.50** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**9.55, 11.50, 12.15 Драма «Выхавацелька» (12+).**
**10.55, 0.25** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 22.00 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка (прамы эфір).
**18.30, 19.20 Серыял «Іншыя» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Гэта іншае.
**23.35** Сфера інтарэсаў.
**0.10** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 18.45 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.35, 19.15** «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
**11.05, 17.00 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**12.30, 20.40, 21.20 Серыял «Сышчыца» (16+).**
**14.20, 19.45 Серыял «Фітнес» (16+).**
**15.15** «На тыдзень» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**18.35** «Вось такія людзі» (12+).
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**22.55** «Зразумець. Прабачыць». Дак. драма (16+).
**23.55** «Тры першыя спатканні» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 15.30** «Беларуская кухня» [СЦ].
**8.00, 14.00, 20.30, 23.15** «Навіны культуры».
**8.10, 17.50 «Сталкер». Маст. фільм (16+).**
**10.50** «Кадры жыцця».
**11.45, 17.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**12.10** «Народны строй».
**12.35, 15.55 «Зігзаг удачы». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.10, 21.05 «Моцны арэшак». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.25** «Кадры жыцця».
**23.30** «Сваімі словамі».

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Жырона» — «Атлетыка» (Мадрыд).
**9.00** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. Агляд.
**10.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — ВРЗ (Гомель).
**12.00, 16.30** Бокс. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. Жанчыны.
**15.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — ХК «Гомель».
**21.40** Спорт-кадр.
**22.15** Футбол. Чэмпіянат Расіі. Агляд.
**23.10** Таэквандо. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. Жанчыны.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.00** «Прапаганда» (16+) [СЦ].
**10.20** «Жыць выдатна!» (16+)
**11.15** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**11.50, 13.15 Серыял «Ідэальная ахвяра» (16+).**
**14.00, 22.50 Серыял «Шчаслівы шанц» (16+).**
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.15** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+) [СЦ].
**21.25** «Беларуская SUPERжанчына» (12+).
**21.35 Серыял «Ранеўская» (12+).**
**0.35** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Рашэнне ёсць!».
**9.30** «Па сутнасці».
**10.40 «Глухар». Серыял (12+).**
**11.35, 23.10** Дак. праект (16+).
**13.45 «Цень за спінай». Серыял (16+).**
**16.50 «Адплата». Серыял (16+).**
**19.00** «Р. S.».
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40 «Шэф-3. Новае жыццё». Серыял (16+).**
**0.30 «Заложнікі Марса» (16+).**

## МІР

**5.00, 3.55 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).**
**5.20 Серыял «Бабін бунт, або Вайна ў Навасёлкаве» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 20.50** «Гульня ў кіно» (12+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.05, 16.15, 1.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.10, 1.55** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.45** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.05** «Назад у будучыню» (16+).
**20.00** «Слабае звяно» (12+).
**22.10 Серыял «Дзікі» (16+).**
**0.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**2.40 Маст. фільм «Арынка».**

## РТР—Беларусь

**6.00** «Новая раніца».
**10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**10.05 Серыял «Асабістая справа» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40 Серыял «Дуэт па праве» (12+).**
**18.45** «Малахаў» (16+).
**19.55** Дзённік конкурсу прыгажосці «Міс Мінск — 2023».
**21.30, 23.15 Серыял «Акушэрка. Новыя серыі» (16+).**
**23.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.25, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**6.55** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**7.30** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.10** «НЗ.by».
**8.55, 10.35 Серыял «Ляснік» (16+).**
**11.20 Серыял «Зверабой» (16+).**
**13.30** Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Дэманы» (16+).**
**16.55** «За гранню» (16+).
**18.00** «ДНК» (16+).
**20.10, 21.30 Дэтэктыў «Аўтсайдар» (16+).**
**22.30, 23.40 Баявік «Неўскі. Цень Архітэктара» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.35, 17.10, 21.00, 2.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад «Лэдзі Баг і Суперкот» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Кніга Боба Фета».**
**8.25 Дэтэктыў «Д'ябальская кава» (16+).**
**10.00 Серыял «Каломба» (12+).**
**11.15 Трылер «Дзённае святло» (12+).**
**13.05 Драма «Ззянне зорак» (12+).**
**14.40** Мультпарад (0+).
**15.00 Прыгоды «Легенда аб Шукальніку» (12+).**
**15.45 Драма «Каралева Поўдня» (16+).**
**17.15 Дэтэктыў «Замах» (16+).**
**19.00** «Вядомыя беларусы».
**19.35 Дэтэктыў «Кароль Талсы» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Драма «Блакада» (12+).**
**23.00 Трылер «З машыны» (16+).**
**0.50 Серыял «Кашмар на вуліцы Вязаў» (18+).**



## ВТБ

**6.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**8.40** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.00** М/ф «Том, які гаворыць, і сябры» (6+).
**9.25** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.55** М/ф «Царэўны» (6+).
**10.15** «Велабайкі» (16+).
**10.40** «Гатуем як шэф» (16+).
**11.25** «Рогаў у справе» (16+).
**12.15** Драма «Знесеныя ветрам» (12+).
**16.15** Драма «1+1» (12+).
**18.15** «На выхад!» (16+)
**19.10** «Вялікая перамога» (16+).
**20.05** Анімацыйны фільм «Камуфляж і шпіянаж» (6+).
**22.00** Фантастыка «Знаёмцеся, Джо Блэк» (12+).
**1.05** Фантастыка «Планета малпаў: рэвалюцыя» (12+).
**3.05** Драма «Вялікая паэзія» (18+).
**5.00** «Даеш моладзь» (16+).
**5.30** Серыял «Ералаш» (6+).

## Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «Фантык. Першабытная казка», «Віні-Пух», «Віні-Пух ідзе ў госці», «Віні-Пух і дзень клопатаў». М/ф.
**8.05** «Тры сустрэчы». Маст. фільм [СЦ].
**9.25** «Мы — грамацеі!»
**10.10** «Старшыня». Маст. фільм [СЦ].
**12.50** «Эрмітаж» [СЦ].
**13.20** Чалавечы фактар [СЦ].
**13.50** «Эфект матылька». Дак. серыял.
**14.20, 1.30** «Як жывёлы размаўляюць». Дак. фільм [СЦ].
**15.10** «Апавяданні з рускай гісторыі».
**16.15** «Небяспечны ўзрост». Маст. фільм.
**17.40** Раман у камені.
**18.10** «Забытая мелодыя для флейты». Маст. фільм [СЦ].
**20.20** «Рудольф Нурэеў. Мяцежны дэман». Дак. фільм.
**22.00** «Агора».
**23.00** Клуб «Шабалаўка, 37».
**0.10** «Малады Каруза». Маст. фільм.
**2.20** «Шэры воўк энд Чырвоная шапачка», «Па ўласным жаданні». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Гронкі гневу» (16+).
**8.05, 9.40, 11.40, 13.00, 14.50, 15.40, 17.30, 19.00, 20.45, 23.30, 2.40, 3.40, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Да і пасля...» (16+)
**13.20** Маст. фільм «Прыгажосць д'ябла» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Кашчэй Бессмяротны» (12+).
**19.20** Маст. фільм «Мантана» (16+).
**21.00** «Быў час» (16+).
**0.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**1.00** Маст. фільм «Чараўнік краіны Оз» (16+).

## EuroSport 1

**3.30, 9.15** Біятлон (6+).
**4.15** Скачкі на лыжах з трампліна (6+).
**5.00** Аўтагонкі на вынослівасць (6+).
**7.00, 7.45** Лыжныя гонкі (6+).
**8.30, 20.45, 1.30** Веласпорт (6+).
**10.00, 11.45, 13.15, 0.00, 0.45** Горныя лыжы (6+).
**10.45, 13.45** Горныя лыжы. Кубак свету, Сальдэў. Мужчыны.
**12.15, 15.00** Горныя лыжы. Кубак свету, Сальдэў. Жанчыны.
**18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету, Вікерсунд. Мужчыны.
**20.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету, Фалун. Мужчыны і жанчыны (6+).
**21.30, 22.30** Конны спорт (6+).

## Кінакамедыя

**0.55** «Дэкрэтны адрыў» (16+).
**3.35** «Superнянь» (16+).
**5.05** «Superнянь-2» (16+).
**6.45** «Куленепрабівальны» (12+).
**8.40** «Грозны тата» (6+).
**10.25** «Каўказская палонніца!» (12+)
**12.15** «Адной левай» (12+).
**13.50** «Начная змена» (18+).
**15.40** «Вясельны перапалох» (16+).
**17.35** «Цёрнер і Хуч» (16+).
**19.30** «Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагодняе бязмежжа» (16+).
**21.15** «Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагодняе бязмежжа-2» (16+).
**22.50** «Твае, мае і нашы» (6+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.35** «Зграя» (16+).
**11.20** «Я стану чэмпіёнам» (6+).
**11.35** «Хопіць чутак». (16+).
**12.05, 4.15** «Гучныя справы» (16+).
**13.00** «Паглядзім» (12+).
**13.30** «Аб здароўі. Жартам і сур'ёзна» (16+).
**14.00** «Сны» (16+).
**14.55** «Дзённік экстрасенса» (16+).
**17.30** «Урачы» (16+).
**18.20** «Хопіць чутак» (16+).
**18.50, 0.20** «Калі-небудзь наступіць заўтра-2» (16+).
**22.00** «Перыскоп» (16+).
**22.20** «Дзённік памяці» (16+).
**3.25** «Гарадскія легенды» (16+).
**5.10** «Ведзьмакі свету». (16+).

## ТБ1000

**5.30** Том, які гаворыць, і сябры (6+).
**6.10** Буба (6+).
**6.40** Прыгоды Бубы (6+).
**6.55** Гатуем з Бубай (6+).
**7.15** Робаты-цыгнікі (6+).
**8.10** Прыбыццё (16+).
**10.15** Арбіта-9 (16+).
**12.00** Ня/глядзячы ні на што (16+).
**14.00** Гатэль «Гранд Будапешт» (16+).
**15.50** Шэф (16+).
**17.20** Шрэк Трэці (6+).
**19.00** Шрэк назаўжды (6+).
**20.35** Маска Зора (12+).
**23.05** Легенда Зора (16+).
**1.20** Успаміны пра будучыню (16+).
**3.25** Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Смяшарыкі (6+).
**7.05** Тры каты (6+).
**8.30** Фіксікі (6+).
**10.00, 10.55, 11.45** Нюхач (16+).
**12.45** Пара з будучыні (12+).
**14.30** Бацька (16+).
**15.55** СуперБабровы (12+).
**17.30** СуперБабровы. Народныя мсціўцы (12+).
**19.05** Сямейны бюджэт (12+).
**21.00** Булкі (16+).
**22.45** Джунглі (12+).
**0.10** Хэпі-энд (12+).
**1.45** Дзённік маці першакласніка (6+).
**3.05** Унук касманаўта (12+).
**4.15** Дублёр (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25, 7.10, 7.55, 1.50, 2.40, 3.25** Дзікі тунец (16+).
**8.40, 9.30, 0.15, 1.05** Аўта-SOS (16+).
**10.20, 11.20, 22.30, 23.25, 4.10, 5.00** Асушыць акіян (16+).
**12.00, 12.50, 13.40** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.25, 15.15, 16.00** «Сапраўдны геній» са Стывенам Хокінгам (16+).
**16.50, 17.35, 18.25** Злавіць кантрабандыста (16+).
**19.15, 20.05** Закінутыя скарбы Егіпта (16+).
**21.00, 21.45** 7 самых цяжкіх дзён (16+).
**5.50** Гульні розуму (16+).

## ЯСНАе

**5.45** М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк» (12+).
**7.15** Маст. фільм «Таксі» (12+).
**8.45** Дак. цыкл «Сувязісты».
**9.10** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік» (12+).
**10.30** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца» (12+).
**11.50** Маст. фільм «Легенда № 17» (12+).
**14.05** Маст. фільм «Лета. 1941» (16+).
**16.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — БАТЭ (Барысаў).
**18.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Іслач» (Мінскі раён).
**20.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Брэст» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**22.00** «Ясна аб кіберспорце».
**22.25** Маст. фільм «Вікінг» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Крэмень» (18+).
**1.25** Маст. фільм «Прыстанак праклятых» (18+).
**3.20** Маст. фільм «Патэнт» (16+).
**4.55** Маст. фільм «Вам — заданне» (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.05, 22.05 Драма «Абрыколь» (16+).**
**8.05** Існачасць [СЦ].
**8.30** Сэнс жыцця (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.15** «Добрай раніцы, Беларусь!» (12+)
**10.05** Здароўе (12+) [СЦ].
**10.55** Дача (12+).
**11.25** Таямніцы следства (12+).
**12.15** Маршрут пабудаваны (12+).
**12.45 Драма «Апошні пялёстак» (16+).**
**13.35** «Я ведаю» (6+).
**15.15** Краіна.
**15.45** Дай пяць (12+).
**16.00** «Генацыд. Без права на жыццё». Мастацка-публіцыстычны фільм (16+).
**16.20** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55, 19.25 Драма «Замак на пяску» (16+).**
**19.00** Пытанне нумар адзін.
**21.00** Панарама.
**21.40** Тэлефільм АТН (12+).
**02.05** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
**9.00** «Зразумець. Прабачыць». Дак. драма (16+).
**10.25, 20.00** Тэлебарометр.
**10.30** «Рыа-2» (6+).
**12.00** «Вежа. Маладзёжная будоўля» (12+).
**12.50** «Маладыя нажы» (16+).
**14.05** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.35 Драма «Звар'яцелае каханне» (12+).**
**16.25 Драма «Пяшчотнае лісце, атрутныя карані» (12+).**
**20.05** «Бітва за цела» (16+).
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20 Драма «Баця» (16+).**
**22.35 Баявік «Людзі Ікс-2» (16+).**

## Беларусь 3

**7.30** «Сіла веры».
**7.55** «Навіны культуры».
**8.05** «Дядзька Сцёпа — міліцыянер». М/ф (0+).
**8.25** «Розныя колы». М/ф (0+).
**8.35 «Дача». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.05** «Новыя людзі».
**10.30** «Беларуская кухня».
**11.00** «То!Лато».
**11.30** «Навука побач» (6+).
**12.00, 17.00** Фінал адборачнага тура ўдзельнікаў XXI Міжнароднага дзіцячага конкурсу «Віцебск-2023».
**14.30** «Новыя людзі».
**14.55** «Сваімі словамі».
**15.35 «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.30** «Кампазітары Беларусі».
**20.20** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.00** «Вялікі тэатр. 90 гадоў».
**21.10** «Фаўст». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

## Беларусь 5

**7.00, 11.00, 15.50** Бокс. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. Жанчыны.
**9.00** Хачу стаць...
**9.30** Вялікі спорт.
**10.15** Гульня галавой.
**11.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Арэнбург» — «Спартак» (Масква).
**13.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Нафтан» (Наваполацк).
**17.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Металург» (Жлобін) / Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Лакаматыў» (Масква) — ФК «Краснадар».
**21.20** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Эспаньёл» — «Сельта».
**22.30** Планета спорту.
...Помню, пасля стыпендыі нам, студэнтам, заўсёды хацелася «адарвацца» — зладзіць свята для згаладалых жыватоў, а калі пашчасціць, — дык яшчэ і для душ.

Адна — Янкава — была ў той вечар дужа засмучаная, бо хлопец — наш «аднапакойнік» — прачуў, што ў Доме дружбы народаў ладзілася чарговая сустрэча з замежнікамі, што пасля афіцыйнай часткі была сяброўская — з пачастункамі, што падчас яе нехта прапанаваў паспяваць народныя песні. І балгары тады зацягнулі сваю, украінцы — сваю, следам — малдаване, казахі... А дайшла чарга да беларусаў, — і аблом, што называецца: адзін саромеецца, другі голасу не мае, трэці слоў не ведае... «Эх, не было там мяне! — перажываў Янак. — Я б ім выдаў!.. Я б ім паказаў! Я б усіх заспяваць прымусіў!»

Наконт першага — «выдаў» ды «паказаў» — мы, Янкавы суседзі па ложках, ні хвіліны не сумняваліся: хлопец і сапраўды ведаў безліч беларускіх песень, выступаў са сцэны, але ж каб некага прымусіць... Да таго ж — усіх?..

— Ды гэта ж лёгка! — ледзь не бажыўся Янак. — Слухайце сюды: зараз мы з вамі развучым цудоўную беларускую народную песню. Я пачынаю адзін, потым мы, усе разам — па маёй камандзе — спяваем прыпеў. Дамова? Тады паехалі!

Янка падняўся з-за стала і стаў не тое расказваць, не тое спяваць, як служыў жа ён у пана ў першае лета і як заслужыў за гэта курачку.

Далей — у паскораным тэмпе і хорам мы падхапілі:

*Тая кура-шчабятура*
*па садочку хо-о-о-одзіць ды хо-о-о-дзіць,*
*куранятак за сабою во-о-о-дзіць.*

На другое лецейка-лета «наш саліст» заслужыў у пана ўжо качачку: «Тая кача дробна скача...», на трэцяе — гусачку, за ёй быў індык, потым баран і цяля... На сёмае лета — урэшце — прэзентам стала дзеўка, якая, напіўшыся, звалілася з печы...

І пры гэтым саліст пасля кожнага лецейка-лета, пасля кожнага новага набытку, вяртаў нас да куры-шчабятуры, усе разам мы (а потым падцягнуліся і хлопцы з суседніх пакояў) з замілаваннем, расцяжна і ўзнёсла, спявалі, як тая курачка «па садочку хо-о-о-одзіць ды хо-о-одзіць, куранятак за сабою водзіць».

Светлая песня! Доўгая, добрая... Мы ёю так захапіліся, што праспявалі і раз, і другі, ды зусім не заўважылі, як наступіў час адбою. Да таго ж думаць не думалі, што з нашага чацвёртага паверха песня пра курачку даляціць да першага, дзе жыў... камендант інтэрната.

Яго, былога вайскоўца, маёра, мы, студэнты, і паважалі, і баяліся (прытым баяліся куды больш, чым паважалі), бо дысцыпліну ён трымаў ну проста жалезную: за дробныя парушэнні караў сур'ёзна (аж да высялення, да пазбаўлення даху над галавой), а ўжо тут...

Дзверы ў пакой рэзка адчыніліся, песня (а з ёй і душа ў кожнага з «артыстаў») умомант абарвалася: на парозе стаяў камендант.

Мы — знямелі ў чаканні расправы, але ж на гэты раз, здаецца, памыліліся:

— Ну нарэшце, — замест прывітання кінуў нам Пятровіч, — ну хоць раз ды пачуў тут нармальную песню! Можаце ж! Можаце, сволачы, калі захочаце! Не ўсё ж бугі-вугі круціць!

У вачах адстаўнога маёра было столькі лагоды, што ён, здаецца, сам мог бы зараз да нас далучыцца — таксама паспяваць пра курачку... Пасада стрымала? Званне? А мо віно ўсё выпілі? Ды і час быў позні.

Усе, карацей, разышліся. А песня — яна засталася.

**Мікалай Камароўскі,**

*г. Орша.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Свая ноша

### Яна няцяжкая, пакуль можаш яе несці

Я даволі доўга не магла ўзяцца за гэту тэму, хоць і хацела. Усё сумнявалася: можа, будзе занадта суб'ектыўна нават для гэтай рубрыкі, бо заснавана, як кажуць, выключна на ўласных назіраннях. Але калі з падобнай праблемай людзі прыйшлі на прыём да Наталлі Качанавай, стала зразумела: выпадак калі і не зусім тыповы, дык не адзінкавы дакладна. І не дай бог быць на месцы дзейных асоб.

Тыя людзі, што прыйшлі да Наталлі Іванаўны, дзейнічалі на апярэджанне. Яны цвярозым розумам падумалі, што будзе з іх дзіцем, калі іх не стане. Уявілі — і жахнуліся. І пайшлі на прыём у высокі кабінет, каб знайсці дапамогу і ўпэўненасць, што з іх хлопчыкам усё будзе добра, нават калі ён застанецца сіратой...

У чым драматызм, спытаеце? У тым, што бацькам ужо пад семдзесят, а «хлопчыку» — амаль сорак. Ён — інвалід першай групы з дзяцінства, існаваць без старонняй дапамогі не можа. Але ж фізічна даволі моцны і, верагодней за ўсё, сваіх бацькоў перажыве. Акрамя бацькоў, за ім няма каму глядзець — самай блізкай радні больш няма. Вось не стане бацькоў — і куды яго? У інтэрнат? «Ён жа там загіне», — са слязьмі казаў бацька на прыёме. Яму паабяцалі, што Міністэрства працы і сацыяльнай абароны будзе трымаць іх сям'ю пад апекай, і пажадалі жыць доўга. Самае шчырае і самае патрэбнае пажаданне, бо такім людзям не заменіць бацькоў нават найлепшы сацыяльны прытулак.

ГЭТА стала тэндэнцыяй менавіта апошняга часу — калі людзі з цяжкімі парушэннямі фізічнага або псіхічнага здароўя, атрыманымі пры нараджэнні або ў раннім дзяцінстве, перажываюць сваіх бацькоў. Якія ў свой час — у 70—80-я гады ўзялі на сябе мужнасць і адказнасць самім выхоўваць дзіця-інваліда. Звычайна ў вёсках людзі не спяшаліся пазбаўляцца ад асаблівага нашчадка, пакорліва ўздыхаючы: «Ужо што Бог даў». Яно так было і заўсёды, але да нядаўняга часу развіццё медыцыны не дазваляла такім дзецям жыць доўга. Яны сыходзілі ў нябыт пры самым аптымістычным раскладзе гадоў у трыццаць—трыццаць пяць, акружаныя любоўю і клопатам самых родных людзей, нават не здагадваючыся, што можа быць неяк інакш. Думаю, не памылюся, калі скажу, што на любых вясковых могілках можна знайсці такое сведчанне — побач ляжаць ужо і бацькі, але яны жылі больш на дзесяць, пятнаццаць, а то і дваццаць гадоў.

Цяпер сітуацыя іншая. Сучасныя прэпараты, урачы, дый сам лад жыцця (прыстойнае харчаванне, напрыклад) выцягваюць такіх людзей, яны і пасля сарака адносна нядрэнна сябе адчуваюць. Жывуць у доглядзе і любові. І — дажываюць да часу, калі хаваюць сваіх бацькоў. Хаваюць, канешне, не яны. Яны застаюцца без догляду, любові, без родных твараў, без знаёмай абстаноўкі. Нават калі ў іх ёсць здаровыя браты-сёстры — ці многія з гэтых здаровых гатовы падхапіць цяжар, які калісьці ўзвалілі на сябе бацькі? Кожны раз адбываецца трагедыя асобна ўзятага чалавека. Асаблівага, не падобнага на іншых, але ж — Чалавека.

ТАЦЦЯНА Пятроўна, былая медсястра ў вясковай бальніцы, гадавала сваю Зою адна — муж доўга не вытрымаў праблемнага дзіцяці, сышоў з сям'і, з'ехаў кудысьці на заробкі, там і згубіўся. У Зоі была цяжкая форма ДЦП, яна амаль не размаўляла, рукі і ногі яе не слухаліся. Маці ў свой час сказалі, што палепшэнне наўрад ці здарыцца, і параілі здаць дзяўчынку ў спецыяльную ўстанову. Таццяна Пятроўна сваю крывінку здаваць нікуды не стала, займалася з ёй, як магла, рабіла ўсялякія масажы. Аднавяскоўцы ўжо прывыклі да гэтай штодзённай карціны: дробненькая худзенькая жанчына вязе інвалідную каляску з дачкой, штосьці ёй разказвае, а тая рэагуе, усміхаецца. Апошні раз калі мы праязджалі праз тую вёску і сустрэлі іх, я са здзіўленнем заўважыла, як раптоўна Таццяна Пятроўна пастарэла і згорбілася. А яе Зоя, мая, напэўна, равесніца, зусім не змянілася і па-ранейшаму бесклапотна ўсміхалася, седзячы ў калясцы, якую маці з цяжкасцю штурхала перад сабой... А цяпер яны ляжаць побач на вясковых могілках. Зоя перажыла маці на паўтара года — яна пражыла семдзесят пяць, дачка — амаль пяцьдзясят. Мясцовыя жанчыны расказалі, што Таццяна Пятроўна памерла раптоўна, у сне. Зоя больш за суткі была халодная-галодная, пакуль не зайшлі суседзі. Жанчыну забралі ў псіха-неўралагічны інтэрнат, але там яна адмовілася есці, кармілі яе прымусова. Пасля перапраўлі ў нейкі іншы інтэрнат, потым яшчэ ў адзін — нідзе не было ёй не тое што добра — проста магчыма жыць. Урэшце яна ціха згасла ў бальнічнай палаце. «Так яно і лепш для ўсіх», — уздыхалі вясковыя кабеты...

Юзік быў у бацькоў старэйшым сынам. Малодшая сястра нарадзілася праз два гады здаровенькая, бацькі ўздыхнулі: «Што Бог даў...» Юзік меў цяжкія парушэнні інтэлектуальнага развіцця і амаль не гаварыў, але бацькі пашкадавалі яго, не аддалі «чужым людзям» — у спецыяльную школу. Хлопца звалі ў вёсцы «дурачком», ён быў бяскрыўдны, усім дапамагаў па гаспадарцы. Але калі адзін за другім бацькі памерлі ад ковіду, гэты здаровы саракапяцігадовы дзяцюк стаў вельмі агрэсіўным, кідаўся на людзей, а пасля зацята замаўчаў. Сястра доўга не думала — аддала яго ў псіханеўралагічную бальніцу. Юзік памёр там праз два месяцы ад інфаркту. «Гэта ж трэба, дурачок, а так перажываў!» — вынеслі вердыкт мясцовыя пляткаркі і назаўтра пасля пахавання і думаць пра яго забыліся.

ТАКІХ людзей у нас не вельмі шмат — лічы, адно пакаленне. Маладзейшыя бацькі, што бяруць на сябе адказнасць выхоўваць асаблівых дзяцей, маюць больш магчымасцяў, жадання, разумення, досведу, каб іх адаптаваць, сацыялізаваць, каб сыход самых блізкіх людзей не азначаў для іх канец існавання. Дык, калі гэтых людзей у нас не вельмі шмат, можа, час стварыць для іх спецыяльную ўстанову, менавіта для тых, хто да сталых год дажыў з бацькамі ў дамашніх умовах? Адну на ўсю краіну — будзе дастаткова. Каб яны маглі дажыць свой, вызначаны лёсам век, адчуваючы сябе людзьмі. Асаблівымі, не падобнымі на іншых, але — людзьмі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Просим **считать недействительной** квитанцию о приеме наличных денежных средств формы 1СУ серии ВА № 4659360 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **в связи с ее утерей.**

УНП 100357923

## 31 марта 2023 года в 10.30 ЗАО «На Уманской» проводит общее собрание акционеров

по адресу: г. Минск, ул. Короля, 9. Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров Общества, будет осуществляться в день проведения собрания по месту его проведения, с 10.00 до 10.30. Форма проведения общего собрания акционеров Общества – очная, форма голосования по всем вопросам повестки дня – открытая. С собой необходимо иметь паспорт.

**УНП 101085067** **Наблюдательный совет**

### ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Речицкого РайПО (продавец) извещает о проведении 21 марта 2023 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Кап. строение с инв. № 340/С-285572 площадью 791,9 кв. м, наименование – скотоубойный цех, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18. Договор аренды № 11/20 от 28.09.2020, срок действия по 31.12.2025. Объект недвижимого имущества обременен ипотекой ОАО «Сбер Банк». Кап. строение с инв. № 340/С-285573 площадью 728 кв. м, наименование – колбасный цех, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18. Кап. строение с инв. № 340/С-3201878 площадью 1332,3 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: три выхода, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/4. Кап. строение с инв. № 340/С-3201879 площадью 599 кв. м, наименование – склад вторсырья, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/5. Кап. строение с инв. № 340/С- 3201880 площадью 192 кв. м, наименование – кожевенный склад, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: пристройка из газосиликатных блоков, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/6. Кап. строение общей площадью 40,8 кв. м, наименование – Трансформаторная подстанция, назначение – Сооружение специализированное энергетики, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18/7. Кап. строение общей площадью 156,7 кв. м наименование – Дезбарьер для автотранспорта с ограждениями из железобетонных плит, назначение – Сооружение неустановленного назначения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, пр-д Коммунальный, 18.

Объекты недвижимости расположены на земельном участке с кадастровым номером 324550100001000187 площадью 4,6800 га (право постоянного пользования).

**Начальная цена** продажи без НДС – 541 240,00,00,00 бел. руб. **Задаток** – 54 124,00 бел. руб.

Расходы по изменению границ земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона; приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Речицкое РайПО,** г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2 . Конт. тел.: +375 29 690-00-10, +375 33 643-43-14.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20.03.2023 в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 1»

27 марта 2023 г. в 14.30 состоится общее собрание акционеров ОАО «Стройтрест № 1» по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15.

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год и основных направлениях деятельности на 2023 год.
2. О работе наблюдательного совета Общества в 2022 году. Оценка деятельности генерального директора Общества наблюдательным советом.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год.
4. О результатах проведения ежегодной обязательной аудиторской проверки годовой бухгалтерской и (или) финансовой отчетности ОАО «Стройтрест № 1» за 2022 год.
5. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2022 год.
6. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2022 год. О выплате дивидендов за 2022 год.
7. Об утверждении плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2023 год и I квартал 2024 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2023 году.
8. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Стройтрест № 1».
9. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
10. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами к годовому общему собранию акционеров Общества можно будет ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15 в кабинете № 213:

- с 1 марта 2023 года по 24 марта 2023 года в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (перерыв – с 13.00 до14.00), 27 марта 2023 года (в день проведения) с 9.00 до 13.00 – ознакомление с информацией о деятельности Общества за 2022 год;
- с 13.03.2023 по 24.03.2023 в рабочие дни с 9.00 до 18.00, 27 марта 2023 года с 9.00 до 13.00 – ознакомление с иными материалами по вопросам повестки дня годового общего собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в годовом общем собрании, будет проводиться 27 марта 2023 года с 13.30 по 14.20 по месту проведения собрания при предъявлении паспорта для акционера Общества, паспорта и доверенности (договора) – для представителя акционера.

УНП 100288960

### Объявляются первые и первые повторные публичные торги по реализации имущества ОДО «МиКСмартАльянс» (первые торги состоялись 09.01.2023 г).

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, WWW.BELTORGI.BY.

Продавец: ОДО «МиКСмартАльянс» (УНП 790688068) в лице ликвидатора Луковской Ирины Степановны, тел. 80296299502, lukov_is@mail.ru).

Предмет первых повторных торгов:

| Номер лота | Наименование | Начальная цена лота с НДС по ставке 20 %, руб. |
|---|---|---|
| Лот 5 | Фальцепрокатный станок б/у | 2 400,00 |
| Лот 6-37 | Вентилятор KB-K – 100 | 64,00 (за 1 лот) |
| Лот 38-71 | Вентилятор KB-K – 125 | 70,00 (за 1 лот) |
| Лот 72-97 | Вентилятор KB-K – 160 | 78,00 (за 1 лот) |
| Лот 98-113 | Вентилятор KB-K – 200 | 84,00 (за 1 лот) |
| Лот 114 | Автомобиль грузовой бортовой GAZ A21R32, 2018 г. в., рег. знак AI 5541-6 | 34 180.00 |

Первые повторные публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации будут проведены: **22 марта 2023 г. 09.00-17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

Предмет первых торгов

| Номер лота | Наименование | Начальная цена лота с НДС по ставке 20 %, руб. |
|---|---|---|
| Лот 1 | Гидравлический пресс, инв. №00000018, введено в экспл. 10.07.13, Шифр 41200 | 2 400,00 |

Первые публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации будут проведены: **13 апреля 2023 г. 09.00-17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Ознакомиться с предметом торгов можно по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 15 или г/п Дрибин, предварительно согласовав по тел. +375 296 299 502 – Ирина Степановна.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 11.03.2023 с 09.00 по 20.03.2023 (12.04.2023) до 17.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY;

2) перечислить задаток по лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Срок заключения договора – 5 календарных дней с даты возмещения затрат на проведение аукциона. Срок оплаты предмета торгов – в течение 10 дней с даты проведения торгов.

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**

(организатор аукциона) по поручению ОАО «Индустрия-СХ» (продавец) проводит открытый аукцион

## по продаже

**склада стройматериалов, цеха переработки удобрений**

**с инв. № 602/С-57502 общей площадью 1504,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624487900001000029 площадью 0,3553 га** *(право аренды по 11.02.2119)* **по адресу: Минская область, Пуховичский район, Туринский с/с, 8, район аг. Ситники.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0095 га; придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, пл. 0,1764 га; земельные участки, расположенные на мелиорируемых (малиорированных) землях, пл. 0,1086 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 195 600,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 19 560,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **11.04.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.04.2023** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: (801713) 44-066, 44 038, 8 (044) 773-33-01.**

УНП 600116180

### Объявляются первые публичные торги по реализации имущества ООО «ЛайтАвтоТрэвел». Организатор торгов: Ликвидатор Луковская Ирина Степановна, lukov_is@mail.ru Продавец: ООО «ЛайтАвтоТрэвел» (УНП 791090063) в лице ликвидатора Луковской Ирины Степановны тел. 80296299502, lukov_is@mail.ru)

Предмет торгов:

| Номер лота | Наименование | Начальная цена лота без НДС, руб. |
|---|---|---|
| Лот 1 | А/м Volkswagen Crafter Kasten гос. № АК 0146-6 выпуск 08.02.2019 | 80 064,15 |
| Лот 2 | А/м Volkswagen Crafter Kasten гос. № АЕ 77 72-6 выпуск 15.11.2018 | 54 293,37 |

(Общество не является плательщиком НДС.)

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Ознакомиться с предметом торгов можно по адресу: г. Могилев, ул. Каштановая, 20А, предварительно согласовав по тел. +375 291 99 14 90 – Сергей.

Торги пройдут 10.04.2023 г. в 12.00 по адресу: 212030, Могилев, ул. Правая Дубровенка, д. 31, оф. 7.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 11.03.2023 09.00 по 09.04.2023 17.00:

**1)** зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах по эл. адресу: **lukov_is@mail.ru или по факсу +375 222 76 45 61;**

***2) перечислить задаток по лоту на р/с BY17AKBB30121081143447000000 ОАО АСБ «Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, получатель – ООО «ЛайтАвтоТрэвел», УНП 791090063.***

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Срок заключения договора – 5 календарных дней с даты возмещения затрат на проведение аукциона. Срок оплаты предмета торгов – в течение 10 дней с даты проведения торгов.

16.03.2023 в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой»

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания – с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров –10.03.2023 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 10.03.2023 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

**ООО «Фрондера»** в газете «Звязда» № 39 (29919) от 28.02.2023 было размещено объявление о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «Вилейский райагросервис»,** назначенного на **13 марта 2023 года.** Торги в отношении лотов № 9 (Кран-балка шил (3 т, 11 м), инв. № 531), № 10 (Котел для нагрева воды, инв. № 607Т), № 11 (Станок 62 г шил, инв. № 627), № 13 (Станок токарно-винт. 163, инв. № 679), № 14 (Станок верт.-фрез. 6 м 12 п, инв. № 686) **отменены** по решению продавца. Подробнее о торгах по тел. +375293042560.

УНП 600010756

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Логойским сельским исполнительным комитетом (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Гостиловичи, пер. Садовый, 9А, кадастровый номер 623284601601000355 | 0,0996 | Газификация, электрификация, водоснабжение | 17 000,00 | 1700,00 | 2328,39 + расходы за размещение объявления |
| 2 | д. Загорье, ул. Армейская, 25 кадастровый номер 623282001601000035 | 0,1945 | Водоснабжение | 8 000,00 | 800,00 | 192,40 + расходы за размещение объявления |
| 3 | д. Знаменка, ул. Поселковая, 20, кадастровый номер 623284603001000255 | 0,1500 | Газификация, электрификация, водоснабжение | 10 000,00 | 1000,00 | 2661,13 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона:** 13 апреля 2023 в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.

**Прием документов** по 10.04.2023 включительно.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Минского областного исполнительного комитета: http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/, Логойского районного исполнительного комитета: http://www.logoysk.gov.by/





# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.38 | 19.03 | 11.25 |
| Віцебск — | 7.28 | 18.52 | 11.24 |
| Магілёў — | 7.28 | 18.53 | 11.25 |
| Гомель — | 7.23 | 18.51 | 11.28 |
| Гродна — | 7.52 | 19.19 | 11.27 |
| Брэст — | 7.52 | 19.20 | 11.28 |

## Месяц

*Поўня 7 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.** Тараса.*
***К.** Яўгеніі, Аляксандра, Макара, Цыпрыяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Песню бярыце з сабою...

# РАЗВІТАЛЬНЫ ВАЛЬС

Рубрыку вядзе кампазітар Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



**Вершы — Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

**Анатоль Грачанікаў (1938—1991) — вядомы беларускі паэт. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. У розныя гады працаваў намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкама камсамола, першым сакратаром Гомельскага гаркама камсамола, загадчыкам аддзела літаратуры газеты «Літаратура і мастацтва», намеснікам старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўным рэдактарам часопісаў «Вясёлка» і «Бярозка». Упершыню выступіў у друку ў 1957 г. Выдаў зборнікі вершаў «Магістраль», «Круглая плошча», «Грыбная пара», «Начная змена», «Дрэва на выспе», «Калі далёка ты...», «Верасень», «Я вас люблю», «Жнівень-45» і іншае. За зборнік вершаў «Грыбная пара» А. Грачанікаву прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі. За зборнік вершаў «Звезды и курганы» паэт быў адзначаны званнем лаўрэата Усесаюзнага літаратурнага конкурса імя Мікалая Астроўскага.**

*1. Туман ружавее світальны,*
*Нябёсы глядзяцца ў раку.*
*Станцуем жа вальс развітальны,*
*Дайце мне вашу руку.*
***Прыпеў (2 разы):***
*Завязь пяшчотнасці.*
*Хваляванне.*
*Хвілі — гадзіны.*
*Гадзіны — хвілі.*
*Рукі звіліся нашы*
*Да рання.*
*І птушкі*
*Нас не будзілі.*

*2. Дзе чайкі кругляюць*
*над плёсам,*
*Дзе свецяць світальна лясы.*
*Дзе зоркі ў вечных нябёсах*
*Нам падаюць галасы.*
***Прыпеў.***
*Проігрыш.*
*3. Чаму вашы ўздрыгваюць*
*плечы,*
*Чаму засмуціўся пагляд?*
*Я ў новыя веру сустрэчы,*
*Верне паром вас назад.*




Даты | Падзеі | Людзі

**10 САКАВІКА**

У краіне

**1878** год — нарадзіўся (Хоцімскі раён) Васіль Раманавіч Брайцаў, расійскі навуковец-хірург, акадэмік АМН СССР, заслужаны дзеяч навукі РСФСР.



**1923** год — нарадзіўся Мікалай Якаўлевіч Зайцаў, Герой Савецкага Саюза, кандыдат філасофскіх навук. У гады Вялікай Айчыннай вайны на 1-м і 4-м Украінскіх франтах, лётчык, камандзір звяра, намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Здзейсніў 185 баявых вылетаў, правёў 15 паветраных баёў, збіў два самалёты, знішчыў каля 20 танкаў, больш за 20 аўтамашын, 43 гарматы, 20 вагонаў. Да 1960-га — у Савецкай Арміі, палкоўнік. У 1967—1995 гг. — выкладчык Белдзяржуніверсітэта.

Нарадзіўся Мікалай Нічыпаравіч Полазаў, партыйны і прафсаюзны дзеяч Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну з верасня 1942 года ў партызанах. Са студзеня 1944-га — намеснік па камсамоле камісара партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б; сакратар Астравецкага падпольнага райкама ЛКСМБ. З 1944-га — сакратар Астравецкага, Пружанскага, Радашковіцкага райкамаў камсамола, затым у ЦК ЛКСМБ. З 1952-га — сакратар Маладзечанскага абкама ЛКСМБ. З 1957-га — сакратар Маладзечанскага, з 1959-га — 1-ы сакратар Вілейскага гаркамаў КПБ. З 1960-га — у ЦК КПБ: намеснік загадчыка, загадчык аддзела партыйных органаў, з 1963-га — загадчык аддзела арганізацыйна-партыйнай работы. У 1970—1986 гг. — старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў.

**1928** год — нарадзіўся Яўген Антонавіч Сідаровіч, беларускі вучоны-біёлаг, член-карэспандэнт АН БССР, доктар біялагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

**1933** год — нарадзіўся Іван Іосіфавіч Ганчарык, беларускі навуковец у галіне тэрапіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Стварыў Рэспубліканскі гастраэнтэралагічны тэрапеўтычны цэнтр (1979).

Нарадзіўся Серафім Антонавіч Андраюк, беларускі крытык і літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук, заслужаны работнік культуры Беларусі.

**1938** год — нарадзілася Роза Іосіфаўна Ганчарова, беларускі навуковец у галіне генетыкі, доктар біялагічных навук, прафесар.

У свеце

**1628** год — нарадзіўся Марчэла Мальпігі, італьянскі біёлаг і ўрач, адзін з заснавальнікаў мікраскапічнай анатоміі. Адкрыў капілярны кровазварот. Апісаў мікраскапічную будову шэрага тканак і органаў раслін, жывёл і чалавека.



**1908** год — нарадзіўся Жазеф Якаўлевіч Коцін, савецкі канструктар цяжкіх танкаў, доктар тэхнічных навук, генерал-палкоўнік інжынерна-тэхнічнай службы, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР. Неаднаразовы лаўрэат Сталінскай прэміі.

**1923** год — нарадзіўся Якаў Аляксандравіч Сегель, расійскі рэжысёр, сцэнарыст, педагог, народны артыст РСФСР.

Так гаварыў...

**ВАСІЛЬ КЛЮЧЭЎСКІ:**

*«Было б сэрца, а клопаты знойдуцца».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Холмс, а чаму мужчыны гатуюць лепш, чым жанчыны?**

**— Элементарна, Ватсан: жанчыны гатуюць для мужчын, а мужчыны гатуюць для сябе!**

Учора суседзяў знізу затапіў... Яны так лаяліся, так лаяліся... Напэўна, развядуцца...

**Людзі, вучыцеся на маіх памылках. Калі раптам жонка спытае вас: «Што ты будзеш рабіць, калі я памру?» — дакладна не варта адказваць: «Хутчэй за ўсё хавацца ад правасуддзя».**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.751. Індэкс 63850. Зак. № 647.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 сакавіка 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12